

ПРЭМ'ЕРА Ў ТЭАТРЫ ІМЯ ГОРКАГА 9

ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ МОЗГУ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родная мове

# ЗВЯЗДА

2 САКАВІКА 2024 г. СУБОТА № 45 (30179)

# Служэнне закону і людзям

**_Супрацоўнікам і ветэранам органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь_**

*Паважаныя таварышы!*

*Віншую з 107-й гадавінай з дня ўтварэння беларускай міліцыі.*

*Больш за стагоддзе органы ўнутраных спраў і ў святы, і ў будні самаадданай працай і мэтанакіраваным служэннем закону забяспечваюць правапарадак у краіне, робячы ўсё магчымае, каб наш народ жыў у спакоі, міры і згодзе.*

*Ваша небяспечная і цяжкая прафесія патрабуе ад кожнага штодзень рашучасці, мужнасці і адвагі, бескампраміснай жорсткасці да злачынца і вялізнай дабрыні да тых, хто мае патрэбу ў абароне. Нашы грамадзяне цалкам давяраюць вам і ведаюць, што беларускі міліцыянер заўсёды з гонарам выконвае свае абавязкі і ў любую хвіліну гатовы прыйсці на дапамогу.*

*Асаблівую ўдзячнасць выказваю жанчынам у міліцэйскіх пагонах, якія нараўне з мужчынамі нясуць увесь цяжар нялёгкай службы. Дзякую маці супрацоўнікаў і іх жонкам, якія забяспечваюць надзейны тыл і ўсімі сіламі падтрымліваюць сваіх любімых мужчын у іх няпростым прафесійным выбары.*

*Сёння мы ўшаноўваем і ветэранаў органаў унутраных спраў, якія ўнеслі вялікі ўклад у барацьбу са злачыннасцю, забяспечыўшы мір і спакой нашай роднай Беларусі. Дзякуй, што і цяпер вы прымаеце самы актыўны ўдзел у патрыятычным выхаванні моладзі, дзеліцеся з ёю асабістым вопытам.*

*Мы ніколі не забудзем геራічныя подзвігі нашых вартавых правапарадку і паймення шануем загінулых пры выкананні службовага абавязку.*

*У гэты святочны дзень жадаю вам і вашым блізкім моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і мірнага неба над галавой.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Старшы лейтэнант **Юлія БАШКЕВІЧ**, участковы інспектар міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі РУУС Першамайскага раёна г. Мінска, заўсёды дапаможа і словам, і справай. Жыхары даверанага ёй участка, як, напрыклад, Любоў Аляксееўна Грандо, гэта добра ведаюць і з ахвотай дзеляцца сваімі навінамі і клопатамі.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба зрабіць усё, каб дэпутаты неадкладна пачалі сваю работу»

## Прэзідэнт даручыў забяспечыць падтрымку ў пераходны для парламента перыяд



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях арганізацыі работы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У кабінет да кіраўніка дзяржавы былі запрошаны Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Вольга Чупрыс, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый Міцкевіч, старшыня ЦВК Ігар Карпенка і начальнік Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Андрэй Навумовіч.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што 25 сакавіка — крайні тэрмін, калі выбраныя дэпутаты павінны прыступіць да выканання сваіх абавязкаў. «У сувязі з гэтым аб чым я хачу вас папрасіць. Дэпутаты — людзі, усе мы людзі, жыць трэба, сем'і карміць і гэтак далей. Давайце дамовімся так: да 1 красавіка ўсе выбраныя дэпутаты будуць атрымліваць зарплату па месцы свайго жыхарства. А з 1 красавіка мы будзем ім заработную плату плаціць, як належыць дэпутатам. Калі будуць нейкія нюансы, вы мне дакладвайце, прымем адпаведныя рашэнні», — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што па сваім вопыце ведае, што гэты пераходны перыяд для дэпутата — вельмі няпросты час для ўсіх. Вялікая нагрузка і на Сакратарыят Палаты прадстаўнікоў. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сакратарыяту і яго начальніку ў гэты перыяд трэба аказаць падтрымку ў арганізацыйным і матэрыяльным планах, каб ён мог падрыхтаваць працоўныя месцы дэпутатам, выслухаць іх пажаданні. «Усіх вас папрашу папрацаваць пару тыдняў у парламенце найсур'ёзнейшым чынам, каб дапамагчы дэпутатам стаць у гэтую каляіну, падрыхтаваць і правесці першае пасяджэнне нашага парламента. Нам трэба, калі ласка, аказаць падтрымку дэпутатам (гэта ўжо як яны папросяць) па фарміраванні кіруючых органаў Палаты прадстаўнікоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Новаму складу ніжняй палаты парламента трэба выбраць старшыню, намеснікаў, сфарміраваць камісіі і абраць іх старшынь. «Трэба дапамагчы вызначыць кіруючы склад, але залішне не ўмешвацца. Гэта справа дэпутатаў, як яны вызначаць там па рэгламенце, па законе, гэтыя мерапрыемствы», — сказаў беларускі лідар.

СТАР. 2

Спорт

# ТУТ ЗАЎСЁДЫ ПАВІННА ВІРАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ

## У чым сакрэт легендарных «Раўбічаў»

ISSN 1990 — 763X

**Рашэнне аб будаўніцтве гэтага спартыўнага комплексу прымалі адразу два Героі Савецкага Саюза — Пётр Машэраў і Віктар Лівенцаў. Тут трэніраваліся спартсмены, якія былі кумірамі савецкіх людзей і захапляюць прыхільнікаў сёння. Гэтае месца стала другім домам для соцень чэмпіёнаў у розных відах спорту. Сёлета Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» адзначае 50-годдзе. У віншаванні калектыву РЦАП Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння «Раўбічы» — суперсучасны шматфункцыянальны спартыўны і турыстычны аб'ект, шырока вядомы ва ўсім свеце. Тут на высокім арганізацыйным узроўні праходзяць найбуйнейшыя міжнародныя спаборніцтвы па біятлоне, лыжных гонках, фрыстайле».**




**Усяму гэтаму папярэднічала вялізная праца, гісторыя якой не менш цікавая, чым падзеі ў легендарным комплексе.**

СТАР. 13

# «ГЕРАІЗМ ВЕДАЮ. ДЗЕ НЕДАХОПЫ?»

Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі Юрыя Назарава

**Першае пытанне, якое задаў кіраўнік дзяржавы, — работа прадпрыемстваў і арганізацый Кіраўніцтва справамі. Найперш — недахопы і праблемы. «У двух словах вынікі. Перш за ўсё — дзе дрэнна. Гераізм я ведаю. А вось дзе дрэнна?» — спытаў Прэзідэнт.**

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на кадравае пытанне.

Юрый Назараў далажыў, што ў цэлым па Кіраўніцтве справамі спрацавалі нядрэнна. «Мы правялі выніковае пасяджэнне калегіі і разабраліся. Паглядзелі не ў цэлым «тэмпературу па бальніцы», а па канкрэтных прадпрыемствах. Ведаем шэраг прадпрыемстваў, па якіх трэба працаваць», — сказаў ён.

Пасля даклада ў Прэзідэнта Юрый Назараў расказаў, што ў Кіраўніцтве справамі бачаць, хто ў структуры недапрацоўвае, дадзены адпаведныя ацэнкі, і сітуацыя будзе выпраўлена. «Я далажыў Прэзідэнту, як мы пачалі год. Мы пачалі яго добра. Адзінае пытанне, якое цяпер бяром на больш прадметны кантроль, — гэта экспарт тавараў і паслуг», — сказаў ён. Юрый Назараў падкрэсліў, што з турыстычнымі паслугамі праблем няма, назіраецца дынаміка росту. А вось з экспартам тавараў маюцца праблемы. «Але, калі ацэньваць тэмпы, у тым ліку па экспарце, то мы ідзём у рамках пяцігодкі. Раней мы крыху папрацавалі лепш, цяпер прытармазілі. Але гэта аб'ектыўныя прычыны».

Што датычыцца кадравага пытання, то Прэзідэнту будзе ўнесены шэраг прапаноў па запаўненні вакансій, у тым ліку кіруючых.

Юрый Назараў таксама заўважыў, што забеспячэнне работы новага склікання парламента — функцыянальны абавязак Кіраўніцтва справамі. «Мы тут зробім усё, што неабходна, каб забяспечыць камфортныя, нармальныя ўмовы працы», — запэўніў ён. Юрый Назараў расказаў, што па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў хуткім часе плануецца правесці рэканструкцыю правага крыла Дома ўрада, дзе размешчана Палата прадстаўнікоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Трэба зрабіць усё, каб дэпутаты неадкладна пачалі сваю работу»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

По традыцыі Прэзідэнт праводзіць сустрэчу з парламентарыямі, якія заканчваюць сваю працу. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба будзе вельмі сур'ёзна падрыхтавацца да гэтага мерапрыемства. «Трэба падзякаваць, узнагародзіць тых, хто заслужыў. Тут не павінна быць ніякіх абмежаванняў, але і не павінна быць навалам, — сказаў ён. — Парламент быў як ніколі самавіты, прыстойны, праблем нікому не ствараў, працаваў як трэба, таму павінны быць заахвочаны тыя дэпутаты, якія гэтага заслугоўваюць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асобную ўвагу на працаўладкаванне дэпутатаў, якія сыходзяць. Па яго словах, у парламенце яны прайшлі вельмі сур'ёзную школу. Таму трэба, каб яны былі працаўладкаваны. «Калі патрэбна нейкая дапамога з майго боку ў працэс працаўладкавання дэпутатаў, якія сыходзяць, вы мяне інфармуйце, будзем вырашаць гэтыя пытанні», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што працы хопіць усім. Ён таксама даручыў кіраўніцтву Адміністрацыі Прэзідэнта не адыходзіць ад гэтых праблем, дапамагчы дэпутатам, Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў, калі будзе неабходнасць — дапамагчы ЦВК.

«Прыцягвайце, каго лічыце патрэбным. Людзі пачуюць сёння маю пазіцыю. І парламент, і Адміністрацыя Прэзідэнта, і іншыя дзяржаўныя органы ўлады падключаюцца і будуць працаваць у тым ключы, які вы задасце ў гэты пераходны перыяд ад аднаго склікання парламента да другога. Трэба зрабіць усё, каб дэпутаты неадкладна пачалі сваю работу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што наперадзе яшчэ вялікая работа па фарміраванні Усебеларускага народнага сходу і падрыхтоўка да яго правядзення. Над гэтым таксама будуць працаваць члены парламента, дзяржаўныя органы. «Паглядзіце, які план павінен быць, як мы будзем праводзіць. Па законе вызначана, калі павінна адбыцца першае пасяджэнне, першая наша сесія, трэба рабіць усё па законе. І трэба вызначыць, якія пытанні ў першачарговым парадку трэба разгледзець на Усебеларускім народным сходзе на першым пасяджэнні», — паставіў задачы кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### ЧАС ПАКАЗАЎ, ШТО МЫ ЎСЁ РАБІЛІ ПРАВІЛЬНА

У размове з журналістамі **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падкрэсліў, што дэпутаты сёмага склікання працавалі ў вельмі няпросты час, калі даводзілася супрацьстаяць знешнім выклікам і ўнутраным пагрозам. «Прэзідэнт, улады працавалі выключна ў інтарэсах беларускага народа. І вялікі ўклад у гэтую агульную справу зрабілі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Я хачу сказаць, што ў цэлым работа Палаты прадстаўнікоў была наладжана эфектыўна. Мы працавалі сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта, Саветам Рэспублікі, урадам, мясцовымі органамі ўлады. Канешне, галоўнай асаблівасцю работы гэтага парламента было тое, што мы стараліся, і гэтага патрабаваў час, вырашаць пытанні аператыўна, рэагаваць на санкцыйны ціск», — сказаў ён.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што парламентарыі ўдзялілі пільную ўвагу падрыхтоўцы якасных законаў. Палатай прадстаўнікоў сёмага склікання прынята 364 законы, 11 з іх распрацаваны непасрэдна дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Сур'ёзная работа зроблена па прывядзенні беларускага заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй. Былі распрацаваны і прыняты новыя законы. «Ва ўмовах гібрыднай вайны нам даводзілася прымаць прадуманыя, рашучыя і часам вельмі жорсткія законапраекты. Час паказаў, што мы ўсё рабілі правільна. Сёння ў краіне забяспечаны мір, стабільнасць, на замку граніца, эканоміка развіваецца, людзі працуюць», — адзначыў спікер ніжняй палаты парламента. Ён падкрэсліў, што новы склад Палаты прадстаўнікоў — людзі падрыхтаваныя, патрыёты. Прэзідэнт даручыў зрабіць усё, каб гэты парламент як мага хутчэй прыступіў да работы і працягнуў заканатворчую дзейнасць. Для гэтага, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, створаны ўсе ўмовы, ёсць належная база.

«Мы сёння перажываем вельмі няпросты час. І адзінства, кансалідацыя — самае галоўнае для краіны», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. Ён заўважыў, што дэпутаты сёмага склікання наладзілі супрацоўніцтва з замежнымі калегамі, актыўна працуюць на міжнародных пляцоўках, створаны шэраг груп дружбы з парламентамі іншых краін. Уладзімір Андрэйчанка пажадаў новаму скліканню захаваць усе гэтыя напрацоўкі і прымножыць іх.

«Самае галоўнае, каб у рабоце не было фармалізму», — падсумаваў ён.

**Начальнік Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Андрэй НАВУМОВІЧ** расказаў, што задачы па стварэнні ўмоў для работы дэпутатаў новага склікання, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы на нарадзе, вырашаюцца пастаянна. «Калі шчыра, у нас сёння няма праблемных пытанняў, якія не вырашаюцца», — адзначыў ён. Андрэй Навумовіч падкрэсліў, што Сакратарыят Палаты прадстаўнікоў выслухоўвае ўсе пажаданні і просьбы дэпутатаў. Па яго словах, сёння ў Палаце прадстаўнікоў створаны ўсе ўмовы для эфектыўнай работы, без празмернасцяў, але з камфортам.

Актуальна

# ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ І ВАЖНЫЯ ПАДЗЕІ

**Першая сесія Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання адбудзецца 22 сакавіка, выбары дэлегатаў УНС пройдуць з 1 да 10 красавіка**

**Даты гэтых важных грамадска-палітычных падзей былі агучаны падчас пасяджэння Цэнтральнай выбарчай камісіі. Такім чынам, прынята рашэнне аб скліканні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і прызначэнні выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Зацверджаны каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэлегатаў УНС ад мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці.**

### У ГАЛАСАВАННІ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ 73,14 % ВЫБАРШЧЫКАЎ

Вынікі выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання агучыў **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА**. Ён адзначыў, што ўпершыню ў Беларусі праведзены выбары дэпутацкага корпуса ў такім фармаце на падставе абноўленай Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. «Выбарчая кампанія прайшла ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам і каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні адзінага дня галасавання, зацверджаным Цэнтральнай выбарчай камісіяй, — паведаміў старшыня ЦВК. — Выбары і галасаванне забяспечвалі 6805 выбарчых камісій. У іх склад было уключана 66 692 чалавекі».

Ігар Карпенка нагадаў, што ў краіне працавала 45 505 нацыянальных і 294 замежныя (міжнародныя) назіральнікі. Па яго словах, на выбарах актыўна праявіла сябе моладзь. З агульнай колькасці грамадзян, якія ўпершыню галасуюць, уключаных у спісы, прыйшлі на выбары ў адзіны дзень галасавання амаль 77 %.

Старшыня ЦВК заўважыў, што стварэнне інфармацыйнага цэнтра пры Цэнтральнай камісіі садзейнічала аператыўнаму і інтэнсіўнаму распаўсюджванню інфармацыі аб галасаванні, ходзе выбараў дэпутатаў, абстаноўцы на выбарчых участках.

Такім чынам, у адзіны дзень галасавання абрана 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Сярод выбраных дэпутатаў з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання 20 чалавек (18,2 %); 27 чалавек з'яўляліся дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў 28-га склікання (24, 5%); жанчыны — 37 (33,6 %); моладзь ва ўзросце да 31 года — 1 чалавек; члены палітычных партый — 70 чалавек, беспартыйныя — 40. Палітычныя партыі прадстаўлены ў Палаце прадстаўнікоў у наступнай колькасці: партыя «Белая Русь» — 51 (46,4 %); КПБ — 7 (6,4 %); ЛДПБ — 4 (3,6 %); РППС — 8 (7,3 %).

Выбраныя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па сваёй працоўнай дзейнасці прадстаўляюць наступныя сферы: 40 % — супрацоўнікі дзяржаўных органаў; 23,6 % — супрацоўнікі сферы навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту; 15,5 % — прадстаўнікі прамысловасці, транспартнай і будаўнічай галін; 7,3 % — прадстаўнікі органаў унутраных спраў, МНС, ваеннай службы; 2,7 % — гандлю, бытавога абслугоўвання, ЖКГ; 10,9 % прадстаўляюць іншыя сферы дзейнасці.

Па выніках выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў у правамоцным складзе сфарміраваны ўсе 1284 Саветы. З іх — 6 абласных і Мінскі гарадскі Саветы; 118 раённых; 10 гарадскіх гарадоў абласнога падпарадкавання; 14 гарадскіх гарадоў раённага падпарадкавання; 8 пасялковых; 1127 сельскіх.

«У ходзе выбараў выбраны 12 511 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Працэнт выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па Рэспубліцы Беларусь, склаў 73,14».

У агульнай колькасці выбраных дэпутатаў мясцовых Саветаў жанчыны складаюць 47,7 %, дэпутаты дзеючага склікання, выбраныя на новы тэрмін, — 50 %, дэпутаты ва ўзросце да 31 года — 3,2 %, дэпутаты, якія прадстаўляюць палітычныя партыі, — 30,4 %. Грамадзянамі Расійскай Федэрацыі, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь і маюць права ўдзельнічаць у выбарах, з'яўляюцца 15 дэпутатаў. Сярод выбраных дэпутатаў 29,6 % працуюць у сферы навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту; 18,5 % — у дзяржаўных органах; 17,1 % — у сельскай гаспадарцы; 10,2 % — у арганізацыях прамысловасці, транспарту, будаўніцтва; 5,4 % — у арганізацыях гандлю, бытавога абслугоўвання насельніцтва, ЖКГ; 3,7 % з'яўляюцца супрацоўнікамі праваахоўных органаў, органаў па надзвычайных сітуацыях, ваеннаслужачымі; 1,5 % — прадпрымальнікамі; 11,4 % прадстаўляюць іншыя сферы дзейнасці, 2,2 % — пенсіянеры; 0,6 % — непрацоўныя.

### ПРАЗРЫСТА І ДЭМАКРАТЫЧНА

Старшыні абласных, Мінскай гарадской выбарчых камісій далажылі аб ходзе правядзення выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання ў сталіцы і рэгіёнах. Агучыўшы асаблівасці электаральнай кампаніі ў сваіх тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінках, старшыні выбарчых камісій адзначылі, што выбары прайшлі спакойна, на высокім арганізацыйным узроўні, у адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Член Цэнтральнай выбарчай камісіі Алена КУНЦЭВІЧ** агучыла высновы місій замежных (міжнародных) назіральнікаў аб падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў. «Адзначаецца, што выбары 25 лютага праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, адкрыта і галосна, прайшлі на альтэрнатыўнай аснове, былі празрыстымі, справядлівымі і адпавядалі прынцыпам правядзення дэмакратычных выбараў, забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян», — паведаміла яна.

Інфармацыю прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў па выніках ажыццяўлення назіральнікаў на выбарах дэпутатаў агучыў **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Вадзім ГРАЧОЎ**. Нагадаем, ФПБ каардынавала работу нацыянальных назіральнікаў. «Выбарчы працэс быў арганізаваны вельмі добра, усё ішло дакладна і зладжана, заўваг да камісій практычна няма, — канстатаваў Вадзім Грачоў. — Усе назіральнікі адзначалі добрую працоўную атмасферу на выбарчых участках і высокую зацікаўленасць грамадзян у выбарчай кампаніі. Галоўная выснова нацыянальных назіральнікаў — у рамках галасавання парушэнняў заканадаўства, якія маглі б паўплываць на ход або вынікі выбарчай кампаніі, няма. Выбары прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні».

Ігар Карпенка адзначыў, што Цэнтрвыбаркам з задавальненнем прыме і вывучыць прапановы, заўвагі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Па яго словах, гэта важна асабліва з улікам трансфармацыі выбарчага заканадаўства.

### ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ УНС — НЕ ПАЗНЕЙ ЗА 25 КРАСАВІКА

На пасяджэнні Цэнтрвыбаркама прынята рашэнне аб скліканні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання. Яна адбудзецца 22 сакавіка 2024 года.

Выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці прызначаны на перыяд з 1 да 10 красавіка 2024 года. Колькасць дэлегатаў, якія падлягаюць выбранню ад мясцовых Саветаў дэпутатаў, — 290 чалавек, ад грамадзянскай супольнасці — 400 чалавек. Вылучэнне дэлегатаў УНС пачнецца з 12 сакавіка і завершыцца 31 сакавіка. Вынікі выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу Цэнтрвыбаркам плануе ўстанавіць не пазней за 18 красавіка. Першае пасяджэнне найвышэйшага органа народаўладдзя павінна прайсці не пазней за 25 красавіка 2024 года.

**Вераніка КАНЮТА.**

Жыллё

# СПРОШЧАНЫ ПАРАДАК ДЗЕЙНІЧАЕ ДА КАНЦА ГОДА

**Грамадзяне могуць скарыстацца спрошчаным парадкам уводу індывідуальных жылых дамоў, які прадугледжаны Указам Прэзідэнта № 253, да 1 студзеня 2025 года. Пра гэта паведаміла начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Таццяна ВАСІЛЮЧАК.**



Як вядома, у канцы студзеня гэтага года ўрад у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы будаўніцтва жылля на 2021—2025 гады, прыняў пастанову № 72, якой зацверджаны заданні па жыллёвым будаўніцтве на 2024 год па агульным уводзе ў эксплуатацыю жылля ў аб'ёме 4,4 мільёна квадратных метраў, з іх з дзяржпадтрымкай — 1,4 млн кв. метраў.

Варта адзначыць, што адзін з асноўных паказчыкаў гэтай пастановы — забеспячэнне будаўніцтва індывідуальнага жылля ў аб'ёме не менш за 50 % ад уводу ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылля ў цэлым па краіне. «Дырэктывай Прэзідэнта № 8 «Аб прыярытэтных напрамках развіцця будаўнічай галіны» устаноўлена, што рэгіёны штогод павінны забяспечваць будаўніцтва індывідуальнага жылля ў памеры не менш за 40 % ад агульнага ўводу. Па выніках мінулага года гэты паказчык склаў 48,1 %. Такую высокую ўдзельную вагу будаўніцтва індывідуальнага жылля ўдалося забяспечыць у тым ліку за кошт актыўнага выкарыстання нормаў, прадугледжаных указамі кіраўніка дзяржавы № 202 «Аб спрошчаным парадку ўзвядзення і рэканструкцыі аб'ектаў будаўніцтва» і № 253 «Аб спрошчаным парадку прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва», — патлумачыла Таццяна Васілючак.

Указам № 253 прадугледжана, што аб'екты будаўніцтва, узведзеныя або рэканструяваныя грамадзянамі на зямельных участках, правы на якія ў іх узніклі да 1 верасня 2022 года і прызначаныя для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных жылых дамоў, могуць па рашэнні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа прымацца ў эксплуатацыю без наяўнасці дазвольнай і праектнай дакументацыі на іх будаўніцтва. Акрамя таго, указам устаноўлена, што аб'екты будаўніцтва, прынятыя ў эксплуатацыю ў рамках Указа № 253, не будуць з'яўляцца аб'ектамі самавольнага будаўніцтва. Для індывідуальных будаўнікоў гэта значнае палягчэнне.

Як адзначыла Таццяна Васілючак, для прыёмкі аб'ектаў у спрошчаным парадку неабходна выканаць пэўныя ўмовы. Па-першае, яны павінны адпавядаць пятаму класу складанасці, а таксама размяшчацца з захаваннем нармаваных парываў да межаў участка і іншых патрабаванняў будаўнічых нормаў і горадабудаўнічай дакументацыі да размяшчэння аб'ектаў. У заяве павінна быць прадугледжана згода паўналетніх грамадзян, якія маюць права валодання і карыстання гэтымі аб'ектамі, а таксама ўдзельнікаў агульнай долевай уласнасці на прыёмку ў эксплуатацыю аб'ектаў у спрошчаным парадку. Для атрымання кансультацыі і афармлення акта прыёмкі ў эксплуатацыю жылых дамоў грамадзянам неабходна звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцы размяшчэння зямельнага ўчастка.

«Для адлюстравання тэхніка-эканамічных паказчыкаў аб'екта рэкамендуецца прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання зямельным участкам, і ведамасць тэхнічных характарыстык», — дадала спецыяліст.

Заява падаецца наўпрост у структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, абыходзячы службу аднаго акна. Уся працэдура прыёмкі аб'екта ў эксплуатацыю займае не больш чым месяц.

За мінулы год у спрошчаным парадку прынята ў эксплуатацыю каля 10 тысяч індывідуальных жылых дамоў. «Указ № 253 носіць часовы характар, і да завяршэння дзеяння ўказа засталося менш за год. Тым не менш у грамадзян яшчэ ёсць час скарыстацца магчымасцю па забеспячэнні прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў у спрошчаным парадку без наяўнасці дазвольнай і праектнай дакументацыі», — удакладніла Таццяна Васілючак.

Больш за ўсё такіх дамоў уведзена на тэрыторыі Мінскай вобласці — амаль чатыры тысячы і Брэсцкай вобласці — больш за дзве тысячы будынкаў. «Агульная плошча прынятых у эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва па Указе № 253 у мінулым годзе склала 725,2 тысячы «квадратаў», або 40 % ад агульнага ўводу індывідуальных жылых дамоў у цэлым па краіне», — паведаміла Таццяна Васілючак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фінансавая палітыка

# РАЗВІТАННЕ З ДОЛАРАМ

## Дэдаларызацыя досыць шырока пакрочыла па нашай краіне. На змену старым фінансавым гульцам хутка прыходзяць новыя

**Высцясненне замежнай валюты з эканамічнага абароту адлюстроўваюць многія індыкатары. Спецыяльны банкаўскі сайт паказвае нам толькі невялікую частку фінансавай мазаікі.**

Так, паводле інфармацыі Нацыянальнага банка нашай краіны, да пачатку года ўдзельная вага нацыянальнай валюты ў актывах беларускіх банкаў павялічылася да 57,3 %. Такім чынам, доля валютных інструментаў у актывах сістэмы абвалілася да 42,7 %. Літаральна год таму значнасць валютных актываў была большай. Доля рублёвых актываў на 1 студзеня 2023 года складала 52,7 %, а валютных — 47,3 %. Толькі за каляндарны год банкаўская сістэма краіны паказала істотны прагрэс у дэвалютызацыі актываў. Паколькі ў тым жа кірунку змяніліся пасівы банкаў, у структуры пасіваў былі зафіксаваны ідэнтычныя карэкціроўкі.

Дарэчы, на прасторах нашай дзяржавы барацьба з «засіллем» долара вялася на працягу не аднаго дзясятка гадоў, але да апошняга часу з пераменным поспехам. Ды няма ліха без дабра.



Працэс дэвалютызацыі значна паскорыўся ў тым ліку за кошт дзеянння санкцый. Многія банкі і кампаніі ў рэальным сектары трапілі пад абмежаванні ЕС і ЗША, што звузіла іх магчымасці работы з доларамі і еўра. На ўнутраным валютным рынку свая атмасфера. У гэтай абстаноўцы жыхары нашай сінявокай інтэнсіўна бягуць ад валюты.

Цяпер насельніцтва краіны «злівае» валютны кэш на працягу рэкорднага часу. Фізічныя асобы ўжо 37 месяцаў выступаюць на ўнутраным рынку як чыстыя прадаўцы наяўнай валюты. За гэты час нашы людзі на нета-аснове рэалізавалі кэш у аб'ёме 4,948 мільярда долараў у эквіваленце.

Важкі ўклад у продаж валютных наяўных грошай даюць фінансавыя інстытуты. У апошнія два гады многія банкі ўводзілі камісіі за захоўванне на рахунках значных сум у валюце, памяншалі стаўкі па дэпазітах у доларах і еўра да ўзроўняў ніжэй інфляцыі ў ЗША і зоне еўра.

Адток валютных укладаў з нашай банкаўскай сістэмы адбываецца на фоне гістарычна нізкіх ставак у доларах і еўра. У студзені гэтага года сярэдні ўзровень ставак па новых тэрміновых банкаўскіх укладах фізічных асоб у долары ўпаў да 0,31 % гадавых. У студзені мінулага года сярэдні ўзровень ставак на гэтым сегменце рынку быў роўны 1,87 %. Аналагічна з еўра: у першыя дні гэтага года ўзровень ставак па новых тэрміновых банкаўскіх укладах для насельніцтва ўпаў да 0,23 % гадавых (1,17 % — годам раней). Па безадзыўных укладах працэнт знізіўся наогул да 0,24 %, а па адзыўных — да 0,05 % гадавых.

Такая мінімальная даходнасць па дадзенай валюце, натуральна, змушае насельніцтва адмаўляцца ад «гульні» ў чужыя нам каштоўныя паперкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Замбіі з прычыны засухі аб'яўлены рэжым нацыянальнага бедства



Рэжым нацыянальнага бедства аб'яўлены ў Замбіі ў сувязі з моцнай засухай. Аб гэтым заявіў прэзідэнт краіны Хакаінд Хічылема, паведаміла ТАСС. «З цяжкім сэрцам мы аб'явілі рэжым нацыянальнага бедства і надзвычайную сітуацыю, паколькі наша краіна сутыкаецца з моцнай засухай, выкліканай з'явай надвор'я Эль-Ніньа, — напісаў кіраўнік дзяржавы ў сацсетцы. — Працяглая засуха паўплывала як на харчовую, так і на энергетычную бяспеку Замбіі, якія з'яўляюцца нашымі ключавымі прыярытэтамі». Хічылема заявіў, што ад засухі пацярпелі 84 акругі краіны са 116. «Кожны другі гектар пасяўных плошчаў ужо адчуў на сабе наступствы адсутнасці вільгаці, — падкрэсліў ён. — Урад будзе працаваць над тым, каб павялічыць імпарт кукурузы і іншых прадуктаў харчавання, пазбегнуць іх дэфіцыту». Прэзідэнт таксама звярнуўся да сусветнай супольнасці: «Мы заклікаем усіх нашых мясцовых і міжнародных партнёраў выкарыстоўваць любыя наяўныя лішкі харчавання для аказання дапамогі».

### Казахстан перайшоў на адзіны гадзінны пояс

Гэта адбылося ў ноч на 1 сакавіка. Адзначаецца, што акіматы гарадоў Астаны, Алматы, Шымкента і Акмалінскай, Алмацінскай, Жамбылскай, Карагандзінскай, Кастанайскай, Паўладарскай, Паўночна-Казахстанскай, Туркестанскай, Усходне-Казахстанскай абласцей, а таксама абласцей Абай, Жэтысу і Улытау перавялі гадзіннік на 1 гадзіну назад. Старшыня Камітэта тэхрэгулявання і метралогіі Міністэрства гандлю і інтэграцыі Казахстана Куаныш Елікбаеў заявіў, што прычына



такога пераходу заключаецца ў тым, што большая частка рэгіёнаў Казахстана да сённяшняга дня выкарыстоўвала ненатуральны, гэта значыць, не свой прыродны гадзінны пояс. Ён растлумачыў, што ўсе рэгіёны краіны, акрамя заходніх, прымянялі UTC+6, у той час як фактычна геаграфічна краіна размешчана ў UTC+5. «Гэтая дэкрэтная гадзіна была дададзена ў свой час для эканоміі энергіі і іншых мэт. Сёння такой неабходнасці няма», — дадаў ён, абгрунтоўваючы вяртанне на натуральны час.

### Apple згортвае праект па стварэнні электрамабіляў



Аб гэтым паведаміла Bloomberg са спасылкай на ананімныя крыніцы ў кампаніі. Аб'ява не была публічнай, паведамленне стала нечаканасцю для амаль дзвюх тысяч работнікаў, якія працуюць над праектам. Адзначаецца, што тэхналагічны гігант адмаўляецца ад аднаго з самых амбіцыйных сваіх праектаў пад кодавай назвай Project Titan. Ён заклікаў быў вывесці Apple ў зусім новую індустрыю. Кампанія адкрыла яго прыкладна ў 2014-м, нацэліўшыся на цалкам аўтаномны электрамабіль з салонам, які нагадвае лімузін, і галасавой навігацыяй. Але амаль з самага пачатку праект адчуваў цяжкасці: Apple некалькі разоў мяняла кіраўніцтва і стратэгію каманды. Многія супрацоўнікі аўтамабільнай каманды, вядомай як група спецыяльных праектаў (або SPG), будуць пераведзены ў падраздзяленне штучнага інтэлекту.

Векапомнае

# У АДНЫМ СТРАІ

## Супрацоўнікі органаў унутраных спраў ушанавалі памяць сваіх калег, якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязку



**Урачыстыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да святкавання Дня беларускай міліцыі, традыцыйна пачынаюцца з рытуалу ўскладання вянкоў і кветак да помніка супрацоўнікам органаў унутраных спраў і ваеннаслужачым унутраных войск, якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязку. У цырымоніі прыняў удзел міністр унутраных спраў, вышэйшы афіцэрскі састаў МУС, ветэраны органаў унутраных спраў і ўнутраных войск, курсанты, ліцэісты і выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў. Галоўнымі героямі мерапрыемства сталі родныя і блізкія тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля абароны іншых.**

Менавіта да іх і звярнуўся міністр унутраных спраў Іван Кубракоў: «Нізкі паклон вам за цярпенне, памяць, і, ведайце, што органы ўнутраных спраў заўсёды разам з вамі. А нашы калегі, якія загінулі, выконваючы службовыя абавязкі, абараняючы іншых грамадзян, заўсёды з намі ў адным страі». Міністр падкрэсліў, што, калі ў сваякоў загінулых узнікаюць пэўныя пытанні, у ведамстве заўсёды гатовы аказаць дапамогу.

Асобныя словы ўдзячнасці — за выхаванне моладзі, за тое, што заўсёды ў адным страі з дзеючымі міліцыянерамі, — Іван Кубракоў адрасаваў ветэранам органаў унутраных спраў. «І пакуль да гэтага помніка, магіл загінулых супрацоўнікаў будзе прыходзіць наша моладзь, перамагчы беларускую міліцыю будзе немагчыма, — падкрэсліў ён. — Захоўвайце памяць і памятайце нашых сяброў».

Кіраўнік міліцэйскага ведамства нагадаў, што Беларусь сёлета адзначае 80-годдзе з дня вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Я не магу не ўспомніць подзвіг нашых калег падчас Вялікай Айчыннай вайны, а менавіта батальён пад кіраўніцтвам капітана Уладзімірава, — удакладніў ён. — Як тады, 80 гадоў таму, так і сёння супрацоўнікі міліцыі аддаюць усё самае дарагое, у тым ліку і жыцці, калі спатрэбіцца, для таго, каб абараніць іншых людзей».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Акцэнты

# «СЁННЯ ХАПАЕ СІЛ І СРОДКАЎ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ АХОВУ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ НА ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

## Іван КУБРАКОЎ — аб прыярытэтных задачах, якія стаяць перад органамі ўнутраных спраў, зніжэнні злачыннасці і важнасці патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення

**Прэс-канферэнцыя напярэдадні прафесійнага свята, Дня беларускай міліцыі, — ужо традыцыйнае мерапрыемства ў працоўным графіку міністра ўнутраных спраў. Гэты год не стаў выключэннем. Падчас сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры кіраўнік міліцэйскага ведамства адказаў на актуальныя пытанні. Аднак папярэдне міністр унутраных спраў выказаў удзячнасць журналістам, якія аператыўна даносяць да грамадства інфармацыю ведамства, у выніку чаго папярэджваецца вялікая колькасць правапарушэнняў.**

### СКАРАЧЭННЕ ДТЗ СА СМЯРОТНЫМ ЗЫХОДАМ І БЯСПЕКА ДЗЯЦЕЙ

Кажучы аб першачарговых задачах міліцыі ў кантэксце даручэнняў Прэзідэнта па забеспячэнні бяспекі, Іван Кубракоў падкрэсліў, што самая галоўная задача для органаў унутраных спраў — забяспечыць бяспеку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. «Мы цудоўна бачым тыя выклікі і пагрозы, якія ёсць сёння, асабліва тое, што адбываецца вакол нашых граніц, таму з улікам гэтай сітуацыі мы будуем нашу работу, — адзначыў ён. — Мы бачым тыя праблемы, якія ёсць у грамадстве. Таму працуем на прафілактыку, каб не дапусціць здзяйснення злачынстваў».

І пэўны вынік ужо ёсць. Назіраецца тэндэнцыя змяншэння колькасці грамадзян, якія загінулі і пацярпелі ад злачынных замахаў. Работа па забеспячэнні дарожнай бяспекі, прафілактычныя мерапрыемствы дазволілі скараціць і колькасць людзей, якія загінулі ў дарожна-транспартных здарэннях. Міністр унутраных спраў адзначыў, што ў мінулым годзе знізілася колькасць здзейсненых забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў, а таксама разбояў і гвалтаванняў. Па яго словах, усе цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы раскрыты, падазраваныя ўстаноўлены.

Асаблівая ўвага супрацоўнікаў органаў унутраных спраў скіравана на забеспячэнне бяспекі дзяцей. Кіраўнік міліцэйскага ведамства паведаміў, што меры прымаюцца, іх на сённяшні дзень дастаткова. «Але самае галоўнае — якасць і ўзаемадзеянне ўсіх дзяржаўных органаў па забеспячэнні бяспекі дзяцей, работа з сем'ямі, — лічыць ён. — Тут адна міліцыя не зможа нічога зрабіць. Усе павінны працаваць у комплексе: дашкольныя ўстановы, установы адукацыі».

Міністр заўважыў, што, калі будзе своечасовая інфармацыя аб злоўжыванні бацькамі спіртных напояў, аб сямейным гвалце, камісіяй па справах непаўналетніх прымуцца своечасовыя рашэнні. Напрыклад, там, дзе неабходна (а гэта, па словах кіраўніка ведамства, ужо крайняя мера), забраць дзяцей з сям'і для таго, каб гарантаваць іх бяспеку, — у абавязковым парадку трэба гэта рабіць.

Іван Кубракоў звярнуў увагу на тое, што да чужой бяды не павінны быць раўнадушныя і звычайныя грамадзяне. «Мы жывём у грамадстве і бачым, як паводзяць сябе нашы суседзі, бачым, калі жанчына выходзіць з пад'езда заплаканая, — канкрэтызаваў ён. — Чамусьці гэта ж адбываецца. У 2023 годзе, у параўнанні з мінулымі гадамі, больш інфармацыі паступіла менавіта ад грамадзян: пачынаючы ад паркоўкі транспарту і заканчваючы выпадкамі гвалту ў сям'і. Таму гэта залежыць і ад нас з вамі, ад усяго грамадства. Калі мы не будзем абыякавымі да гора, якое адбываецца ў суседзяў, то, вядома, раней зможам спрацаваць і захаваць пэўнае жыццё. Таму самая галоўная задача — скаардынаваць гэтую работу, разам і своечасова рэагаваць. Тады і будзе вынік. Сёння і заканадаўства, і рычагоў прафілактыкі дастаткова для таго, каб навесці ў гэтым плане парадак».

### ЯКАСНЫЯ КАДРЫ І ГОДНАЯ ЗМЕНА

Адказваючы на пытанне журналіста аб матэрыяльным забеспячэнні органаў унутраных спраў, Іван Кубракоў акцэнтаваў увагу на тым, што сёння хапае сіл і сродкаў, каб забяспечыць ахову грамадскага парадку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. «Спецыяльных сродкаў таксама дастаткова для таго, каб адрэагаваць у асаблівых умовах, — удакладніў ён. — Мы ўсё робім з разліку горшай сітуацыі, якая можа быць. У тым ліку, вядома, і з улікам вопыту 2020 года. Аналізуем сітуацыю, якая адбываецца за межамі нашай краіны, вывучаем вопыт абсалютна ўсіх краін. З упэўненасцю магу сказаць, што тыя сілы і сродкі, якія ў нас ёсць, дазваляюць забяспечваць ахову грамадскага парадку».

Кажучы аб укамплектаванасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, генерал-лейтэнант міліцыі заявіў, што кадравага голаду няма абсалютна ва ўсіх падраздзяленнях. Цяпер у ведамстве адзначаецца найлепшы вынік па кадравым забеспячэнні за апошнія 13 гадоў. Пры гэтым міністр падкрэсліў, што намаганні тых сіл, якія спрабавалі разгайдаць сітуацыю ў краіне ў 2020 годзе, не спраўдзіліся. Нягледзячы на пэўныя запалохванні супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, моладзь з задавальненнем ідзе на службу ў міліцыю.

«З улікам нашай работы з моладдзю, патрыятычнымі клубамі мы бачым, што толькі за 2023 год з заявамі ў органы ўнутраных спраў звярнуліся больш за восем тысяч маладых людзей, — канстатаваў Іван Кубракоў. — Так, 50 % мы адмовілі, бо лічым, што якасць павінна быць на самым высокім узроўні. Мы не можам дазволіць, каб у органах унутраных спраў служылі выпадковыя чалавек».

Журналісты звярнулі ўвагу на вялікую патрыятычную работу, якая праводзіцца міліцэйскім ведамствам, і ў сувязі з гэтым пацікавіліся, наколькі ў сучасных падлеткаў запатрабаваны ваенна-патрыятычныя клубы, створаныя пры часцях унутраных войскаў. Міністр згадаў, як пачыналася гэтая работа, калі на базе вайсковай часці 3214 быў створаны першы ваенна-патрыятычны клуб, і як па-рознаму адносіліся да патрыятычнай работы ведамства ў грамадстве. Сёння ў міністэрства паступае шмат просьбаў, звязаных з арганізацыяй такіх клубаў на базе воінскай часці, школы і гэтак далей.

Як падкрэсліў Іван Кубракоў, самае галоўнае, што хлопцы і дзяўчаты па ўласным жаданні наведваюць ваенна-патрыятычныя клубы, ім гэта вельмі цікава. Ён паведаміў, што пад патранатам МУС створаны 135 ваенна-патрыятычных клубаў, дзе займаюцца амаль пяць тысяч удзельнікаў. Сярод іх — шмат дзяўчат. «Патрыятычныя клубы адкрываюцца не толькі пры органах унутраных спраў, але і пры воінскіх часцях, МНС і іншых сілавых структурах, — удакладніў міністр. — Гэта наш кадравы рэзерв. Жаданне займацца, служыць ва ўсіх ёсць».

### АБ УДЗЕЛЕ МОЛАДЗІ Ў АХОВЕ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І НЕАБЫЯКАВЫХ ГРАМАДЗЯНАХ

Кіраўнік міліцэйскага ведамства адзначыў, што ўсё больш грамадзян выказвае жаданне прыняць удзел у ахове грамадскага парадку. У якасці прыкладу ён прывёў забеспячэнне аховы грамадскага парадку падчас выбарчай кампаніі. «Сумесна з намі службу па ахове грамадскага парадку неслі дружыннікі, — расказаў Іван Кубракоў. — Але самае галоўнае — гэта наша моладзь, маладзёжныя атрады аховы грамадскага парадку». Пры гэтым, па словах генерал-лейтэнанта міліцыі, моладзь з вялікім задавальненнем падключылася да гэтай работы і такіх людзей становіцца ўсё больш.

Расце і колькасць грамадзян, якія паведамляюць аб тым ці іншым правапарушэнні, у міліцыю. Гэта, па словах міністра ўнутраных спраў, у пэўнай ступені сведчыць аб даверы да міліцыі.

Кажучы аб ахове грамадскага парадку на выбарчых участках, Іван Кубракоў адзначыў, што, нягледзячы на дробныя адміністрацыйныя правапарушэнні, ахова грамадскага парадку была забяспечана. «Што датычыцца выбараў кіраўніка дзяржавы ў 2025 годзе, мы пастаянна знаходзімся ў гатоўнасці і ўдасканальваемся, — падкрэсліў ён. — Мы вельмі цесна ўзаемадзейнічаем з нашымі калегамі з іншых краін, пераймаем вопыт, глядзім, як забяспечвалася там ахова грамадскага парадку. І, вядома, мы ўжо рыхтуемся і працуем у гэтым кірунку. Праводзяцца розныя мерапрыемствы, у тым ліку і ў аператыўным плане».

Міністр заўважыў: тое, што выбары дэпутатаў у адзіны дзень галасавання прайшлі вельмі спакойна, не залежала толькі ад прысутнасці супрацоўнікаў міліцыі на выбарчых участках. «Спрабавалі зладзіць пэўныя правакацыі, у тым ліку і ў інтэрнэце, але мы працавалі на прафілактыку, апярэджанне, — канкрэтызаваў ён. — Менавіта гэта работа ўсяго сілавога блока дала магчымасць забяспечыць ахову грамадскага парадку. І ўсе грамадзяне ўбачылі, што сапраўды спакойна мы прайшлі гэты перыяд і ніякіх пытанняў не было».

**Вераніка КАНЮТА.**

Тонкасці прафесіі

# ПАДЫХОД ГАРДЗІЕЎСКАГА

## Як участковы інспектар па справах непаўналетніх знаходзіць агульную мову з дзецьмі



**Свой першы працоўны дзень у міліцыі старшы ўчастковы інспектар па справах непаўналетніх Уладзімір ГАРДЗІЕЎСКІ памятае вельмі добра — як быццам учора пераступіў парог РУУС Першамайскага раёна г. Мінска. А між іншым, было гэта ў лістападзе 1998 года. Прыйшоўшы сюды ўчарашнім студэнтам педуніверсітэта, настолькі захапіўся прафесіяй, што, нягледзячы на шматлікія прапановы, якія паступалі на працягу службовай дзейнасці, затрымаўся ў адным месцы і на адной пасадзе ажно на 25 гадоў!**

### З НАСТАЎНІКА — У МІЛІЦЫЯНЕРЫ

Працаваць з дзецьмі ён марыў з маленства. Уладзімір Віктаравіч нарадзіўся ў сям'і школьных настаўнікаў: маці выкладала дзецям рускую мову і літаратуру, бацька — хімію і біялогію. На гэтую спецыяльнасць у Беларускі дзяржаўны універсітэт імя М. Танка пасля заканчэння школы вырашыў паступаць і сын. Аднак так склалася, што настаўнікам ён ні дня не працаваў.

Скончыўшы вышэйшую навучальную ўстанову, хлопцы-аднадумцы вырашылі паспрабаваць свае сілы ў міліцыі. Разам з аднакурснікамі ў РУУС Першамайскага раёна сталіцы прыйшоў і Уладзімір Гардзіеўскі. Прапанавалі месца ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Ён і пагадзіўся: дзяцей любіў і ўмеў знайсці да іх падыход.

Праўда, апошняе яму, афіцэру-пачаткоўцу, так толькі здавалася. Працаваць даводзілася, мякка кажучы, не з паслухмянымі дзецьмі. Аднак з вопытам і з імі здолеў знайсці агульную мову. «Усё проста, — заўважае падпалкоўнік міліцыі. — З любымі дзецьмі лёгка выбудоўваць дыялог, калі ты не ставіш сябе вышэй за іх, а паводзіш сябе на роўных. У такім выпадку табе давяраюць і прыслухоўваюцца да таго, што ты кажаш».

### ЧАМУ ПАДЛЕТКІ ІДУЦЬ НА НЕАБДУМАНЫЯ ЎЧЫНКІ?

Кожную сераду ў старшага ўчастковага інспектара па справах непаўналетніх — школьны дзень. У абавязковым парадку Уладзімір Гардзіеўскі абыходзіць замацаваныя за ім навучальныя ўстановы: сталічныя гімназію № 18, сярэднюю школу № 73 і гімназію-каледж мастацтваў імя І. Ахрэмчыка. Праводзіць прафілактычныя гутаркі са школьнікамі, павышае прававую дасведчанасць педагагічнага калектыву, удзельнічае ў саветах прафілактыкі, рэагуе на канкрэтныя праблемныя моманты, кантралюе дзяцей, якія знаходзяцца на прафілактычным уліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх.

У іншыя дні наведвае апошніх дома. Таксама бывае ў сем'ях, якія стаяць на ўліку як тыя, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. Хапае і аператыўнай работы, калі ў грамадскім месцы даводзіцца затрымліваць непаўналетніх, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення, або сярод ночы выязджаць на пошукі дзіцяці, якое пасварылася з бацькамі і не вярнулася дахаты. І гэта толькі на першы погляд здаецца, што з дзецьмі працаваць нескладана.

Пакуль ідзём у гімназію № 18 г. Мінска, Уладзімір Віктаравіч расказвае, што многія памыляюцца, калі лічаць, што ў поле зроку міліцыі трапляюць дзеці толькі з неблаганадзейных сем'яў. «Як правіла, непаўналетнія, у адносінах да якіх праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, выхоўваюцца ў шчаслівых, забяспечаных сем'ях, — адзначае Уладзімір Гардзіеўскі. — Звычайна гэта поўныя сем'і, нярэдка бацькі займаюць кіруючыя пасады. Чаму так адбываецца, што іх дзеці трапляюць у поле зроку міліцыі? Вопыт паказвае, што ўсяму віной нядобрая кампанія. Часта даводзіцца чуць, што спакойную, хатнюю дзяўчынку ўпершыню без дарослых выпусцілі ў горад пагуляць з сяброўкамі, а яна пакаштавала алкаголь і трапіла на вочы праваахоўнікаў. Атрымліваецца, што, каб не быць «белай варонай», падлеткі ідуць на неабдуманыя ўчынкі. У прыватнасці, паспрачаўшыся з сябрамі, імкнуцца нешта ўкрасці. Непаўналетняму і не патрэбная тая рэч, але здзяйсняюць правапарушэнне, каб нешта даказаць сваім таварышам».

Па словах старшага ўчастковага інспектара па справах непаўналетніх, каб не дапусціць падобнага, бацькі павінны ведаць, з кім праводзіць час або перапісваецца ў сацыяльных сетках іх нашчадкі. «Кола зносін дзіцяці мае вялікае значэнне ў яго выхаванні, — падкрэслівае ён. — Дарослыя заўсёды могуць звярнуцца да нас, калі ўзніклі праблемныя пытанні. Гэта не значыць, што мы абавязкова будзем усё фіксаваць. Часам дастаткова толькі пагутарыць з кімсьці з кампаніі падлетка, з ім самім, як дзеці разумеюць, што трапілі ў поле зроку міліцыі і пачынаюць сябе паводзіць па-іншаму».

### КАЛІ ВАРТА ЗАБІЦЬ ТРЫВОГУ?

Будучы ў гімназіі, Уладзімір Гардзіеўскі накіроўваецца ў кабінет да дырэктара. Перш чым прыступіць да работы з дзецьмі, цікавіцца ў кіраўніка навучальнай установы, ці ёсць пэўныя праблемы, пытанні. Сёння такіх няма, таму па плане — работа з сямікласнікамі.

Пакуль старшы ўчастковы інспектар па справах непаўналетніх размаўляе са школьнікамі аб небяспечнасці наркаспажывання і адказнасці за распаўсюджванне наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, **дырэктар гімназіі № 18 г. Мінска Юлія НОВІК** адзначае шчыльнае ўзаемадзеянне навучальнай установы з органамі ўнутраных спраў.

— Вельмі моцна супрацоўнікі міліцыі нам дапамагаюць з прававога пункту гледжання, — звяртае ўвагу кіраўнік навучальнай установы. — Уладзімір Віктаравіч умее знайсці падыход да дзяцей, можа патлумачыць, як правільна сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі. Навучэнцы не заўсёды могуць пачуць нас, педагогаў, але абавязкова прыслухоўваюцца да нашага ўчастковага інспектара. І гэта вельмі радуе. Як і тое, што сур'ёзныя пытанні ён тлумачыць дзецям вельмі спакойна, даступна. У міліцыянера наладжаны цесны кантакт з дзецьмі. Аб гэтым сведчыць хоць бы той факт, што часам яны ідуць па параду не да настаўнікаў, а да Уладзіміра Віктаравіча.

З кожнай узроставай катэгорыяй у старшага ўчастковага інспектара па справах непаўналетніх — размовы на розныя тэмы. Калі з вучнямі пачатковых класаў ён гутарыць больш пра правілы паводзін пры пераходзе дарогі або пры сустрэчы з незнаёмцамі, то са школьнікамі сярэдняга і старэйшага ўзросту ўздымаюцца больш сур'ёзныя тэмы. На канкрэтных прыкладах Уладзімір Гардзіеўскі расказвае, чым можа скончыцца або лёгкі заробак, або тая ці іншая забава.

Актуальная тэма, якую ён апошнім часам уздымае ў любой узроставай катэгорыі, — педафілія. І такі выпадак, на жаль, на яго ўчастку ўжо быў. Справа была ў пачатку 2000-х. Хлопчык пазнаёміўся з мужчынам, які частаваў яго марожаным, цукеркамі, затым запрашаў да сябе паглядзець кінафільмы і ў далейшым здзяйсняў у дачыненні да яго супрацьпраўныя дзеянні. Калі падлетак пачаў прагульваць школу і інфармацыя аб гэтым паступіла да ўчастковага, пачала праводзіцца праверка. Як высветлілася, бабуля, якая з'яўлялася апекуном дзіцяці, была ў курсе сітуацыі, але ўтойвала гэтыя факты ад праваахоўных органаў. У выніку даверлівай гутаркі з участковым інспектарам па справах непаўналетніх пацярпелы расказаў, што з ім адбываецца. У адносінах да грамадзяніна, які здзяйсняў злачынствы супраць палавой недатыкальнасці непаўналетняга, была заведзена крымінальная справа.

Каб пазбегнуць падобнага, Уладзімір Гардзіеўскі рэкамендуе бацькам звярнуць увагу на паводзіны свайго дзіцяці. «Калі яно стала замкнёным, гэта ўжо нагода забіць трывогу, — кажа ён. — Насцярожыць павінна і тое, што падлетак позна прыходзіць дахаты або ў яго з'явіліся дарагія рэчы».

### ЭФЕКТЫЎНЫЯ МЕРЫ І НАЙЛЕПШАЯ ЎЗНАГАРОДА

Калі вяртаемся ў РУУС, Уладзімір Гардзіеўскі расказвае, што яго падапечнымі, у адносінах да якіх праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, з'яўляюцца дзевяць непаўналетніх. Двое з іх вучацца ў гімназіі, якую мы толькі што наведалі. Хлопец трапіў на індывідуальны прафілактычны ўлік інспекцыі па справах непаўналетніх за бойку, дзяўчына — за знаходжанне ў грамадскім месцы ў нецвярозым стане.

Невыпадкова на асаблівым кантролі міліцыянераў знаходзяцца гандлёвыя цэнтры. Нярэдка ў кампаніі дарослых людзей, якія распіваюць алкагольныя і слабаалкагольныя напоі, заўважаюць і непаўналетніх. У выніку на дарослых людзей складаюцца адміністрацыйныя пратаколы. Што датычыцца падлеткаў, інфармацыя аб іх паводзінах накіроўваецца ў камісію па справах непаўналетніх, перадаецца ўрачу-нарколагу, які са свайго боку праводзіць прафілактычную работу.

— У цэлым, правапарушэнняў і злачынстваў сярод моладзі стала менш, — канстатуе старшы ўчастковы інспектар па справах непаўналетніх. — Памятаю часы, калі толькі за адзін вечар у тым жа парку Чалюскінцаў, дзе часта арганізоўвалі дыскатэку, складалася мінімум пяць пратаколаў. Цяпер сітуацыя іншая. Усё дзякуючы эфектыўнай прафілактычнай рабоце органаў унутраных спраў. Акрамя таго, усюды ў горадзе ўстаноўлены камеры відэаназірання, што, вядома, стрымлівае маладых людзей.

Як расказвае падпалкоўнік міліцыі, узмацніўся кантроль і за сем'ямі, якія стаяць на ўліку як тыя, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. Апошнія трагедыі ў Слуцку і Оршы, калі дзеці загінулі ад рук сваіх бацькоў, паказваюць: калі ў сем'ях хоць бы хто-небудзь з бацькоў злоўжывае алкаголем або выхаваннем дзяцей ніхто не займаецца, нярэдка такія дзеці маюць патрэбу ў дапамозе і нават абароне.

За час службы даводзілася забіраць дзяцей з сям'і і Уладзіміру Гардзіеўскаму. І ён цвёрда ўпэўнены: тыя бацькі, якія жадаюць вярнуць сваіх дзяцей, кінуць піць, уладкуюцца на работу і прывядуць сваё жыллё ў парадак. Па яго словах, кантроль за нешчаслівымі сем'ямі з боку праваахоўных органаў з усімі зацікаўленымі суб'ектамі прафілактыкі становіцца ўплывае на паводзіны бацькоў.

Найлепшая ўзнагарода для Уладзіміра Гардзіеўскага — калі на вуліцы яго сустракаюць былыя падапечныя і дзякуюць, што ў свой час трымаў іх у яжовых рукавіцах. Падпалкоўнік міліцыі прызнаецца, што ніколі не хацеў працаваць у іншых падраздзяленнях органаў унутраных спраў. «Сітуацыі бываюць розныя, часам нестандартныя, таму нават цікава знаходзіцца на адным месцы, — кажа ён. — Ніколі не пашкадаваў аб сваім выбары. Калі б можна было вярнуць усё назад, то паўтарыў бы гэты шлях».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# У аб'ектыве — работа МУС




**Вынікі рэспубліканскага конкурсу МУС «У аб'ектыве!» падвялі ў музеі Міністэрства ўнутраных спраў. Сярод фіналістаў — загадчык аддзела фотаілюстрацыі Выдавецкага дома «Звязда» Віктар ІВАНЧЫКАЎ.**

Выбраць найлепшыя фота- і відэаработы аб дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войск было няпроста, бо на перамогу прэтэндавала каля 300 творчых работ.

Як адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Дзмітрый КАРЗЮК,** у ведамстве праходзіць велізарная колькасць мерапрыемстваў, а таму важна дакладна данесці інфармацыю пра іх да людзей. «Рэспубліканскі конкурс «У аб'ектыве!» адбыўся пяты раз, — нагадаў ён. — Прыемна, што ўдзельнікі дасылаюць творчыя праекты, якія яскрава паказваюць спецыфіку дзейнасці вартавых парадку, наглядна расказваюць, з чым ім даводзіцца сутыкацца кожны дзень». Дзмітрый Карзюк выказаў упэўненасць у тым, што творчае супрацоўніцтва прадоўжыцца і пойдзе на карысць бяспецы нашай краіны і фарміраванню іміджу беларускага народа.

Усяго ў конкурсе было шэсць асноўных намінацый і адна спецыяльная — «Міс «У аб'ектыве!», якая з'явілася сёлета ўпершыню па ініцыятыве **начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Наталлі САХАРЧУК.** Яе была ўдастоена навучэнка сталічнай гімназіі № 61 Софія Свішчава. Нягледзячы на юны ўзрост, дзяўчынка ўжо зорка відэаролікаў аб дзейнасці ведамства. Загадчык аддзела фотаілюстрацый Выдавецкага дома «Звязда» Віктар Іванчыкаў стаў фіналістам у намінацыі «Бяспека са знакам якасці». На конкурс ён прадставіў рэпартаж, на якім адлюстраваны ўчастковы інспектар міліцыі лейтэнант Андрэй Пікта падчас размовы з жыхарамі Савецкага раёна.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «МСУ № 217», 220012, г. Минск, пер. Калининградский, 16 |

**Предмет электронных торгов, реализуемый одним лотом, в составе**

| Наименование | Адрес |
|---|---|
| **Арочник** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 600/С-172793, общей площадью 656,4. Составные части и принадлежности: пристройка | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 19/ 3 |
| **Контрольно-пропускной пункт** (здание неустановленного назначения), инвентарный номер: 600/С-173681, общей площадью 40,3 кв. м | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 19/1 |
| **Незавершенный незаконсервированный объект**, создаваемый в рамках архитектурного проекта «Административно-производственный корпус и площадки складирования» (есть проектная документация). **Забор (ограждение)**, инв. № 2155 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 19 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Предоставлен на праве аренды по 27.02.2092 г. для строительства и обслуживания зданий и сооружений производственной базы общей площадью 1,6097 га (кадастровый номер 641500000001001741) |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **9 132 960,00 бел. руб.** |

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**:
**03.04.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.04.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70546 (наименование: здание для откорма скота; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 2047,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027553, площадью 1,4951 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика, площадка для складирования навоза, водонапорная башня, артскважина, погрузочно-разгрузочная рампа стационарная с весами**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 133 600,00 | Размер задатка, руб. | 13 360,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, тел./ф. 8016 29 18159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 20 марта 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 19 марта 2024 г. до 17.00**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в республиканской собственности

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Г.002.00030** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебского отделения Белорусской железной дороги» тел.: +375 212 33-33-00, 33-39-25.

**Организатор, Оператор ЭТП ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by**.

**Дата и время проведения торгов: 01.04.2024 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 3 года изолированного помещения с инв. № 200/D-96540 (назначение – помещение общественного питания, наименование – кафе), общей площадью 214,6 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Некрасова, 2А-3.

Целевое использование: для организации общественного питания и производства пищевой продукции, для размещения магазина розничной торговли непродовольственными товарами, для размещения складских помещений. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 1.5.

**Нач. цена: 906,69 руб.** Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by (№ 22395) на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ
ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АйсЭксперт», Брестская обл., г. Кобрин, пер. Дорожный, 7а |

**Предмет электронных торгов: имущество, расположенное по адресу: г. Кобрин, дорожный переулок 7а**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (высший сорт) массой 14 200 кг | **33 739,20** (снижена на 85,3 %) |
| **2** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (третий сорт) массой 2473 кг | **4 184,32** (снижена на 85,3 %) |
| **3** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (несортовая) массой 2078 кг | **2 194,37** (снижена на 85,3 %) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** (по лоту **№ 1**) и **8 %** (по лоту № 2), **10 %** (по лоту № 3) от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.01.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**13.03.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.03.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

01 апреля 2024 года в 13.00 состоится очередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Житковичлес».

Повестка дня

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год и основные направления деятельности Общества в 2024 г.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2023 г.
4. О выплате дивидендов и утверждении распределения прибыли Общества за 2023 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2024 г. и в первом квартале 2025 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Решение Наблюдательного совета ОАО «Житковичлес» о проведении общего собрания акционеров принято на заседании протоколом № 1 от 28.02.2024 г.

Дата закрытия реестра – 1 марта 2024 г.
Местонахождение ОАО «Житковичлес»: г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80.
Место проведения собрания: г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80.
Время регистрации в день проведения собрания с 12.30 до 12.50.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 20.03.2024 г. (с 14.00 до 16.00 ) и в день проведения собрания с 10.00 до 12.00 по месту нахождения Общества.

УНП 400049968

## ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 10/24 по продаже одним лотом изолированных помещений, находящихся по адресу: г. Минск, ул. Геологическая, 87Г

**Предмет аукциона**

| № лота | Номер помещения | Инвентарный номер | Наименование | Площадь, кв. м |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 | 500/D-687338 | Помещение склада | 309,2 |
| | 2 | 500/D-687339 | Производственно-складское помещение | 526,2 |
| | 3 | 500/D-70794861 | Административное помещение | 104,5 |
| | 4 | 500/D-707946617 | Административное помещение | 31,3 |
| | 5 | 500/D-707946618 | Административное помещение | 30,8 |
| | 6 | 500/D-707946619 | Помещение неустановленного назначения | 20,2 |
| | 7 | 500/D-707946620 | Административное помещение | 175,6 |
| | 8 | 500/D-707946621 | Административное помещение | 53,9 |
| | 9 | 500/D-707946622 | Административное помещение | 29,8 |
| | 10 | 500/D-707946623 | Административное помещение | 188,6 |

Помещения находятся в капитальном строении с инвентарным номером 500/С-23133, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 500000000001034327 площадью 0,2145 га. Доля собственника помещений составляет 171/200 в общем долевом праве аренды на земельный участок. С целью обеспечения проезда, прохода и ведения хозяйственной деятельности заключено соглашение об установлении сервитута соседнего земельного участка, сервитут будет передан новому владельцу. Обременение: аренда

**Начальная цена продажи лота – 492 600 долларов США с учетом НДС 20 %,**
сумма задатка – 300 бел. руб., шаг аукциона – 5 % от начальной цены продажи

**Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015.**
**Продавец: ООО «Улмарит», ул. Геологическая, д. 87Г, пом. 10, комн. 307, г. Минск, 220138**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. Внести задаток в указанном размере на расчетный счет организатора аукциона BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22, получатель платежа – ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 10/24»;
2. Подать заявление на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Положением «О порядке организации и проведения аукциона № 10/24» (далее – Положение).

**Последний день приема заявлений и внесения задатка: 02.04.2024 до 17.00.**
**Аукцион состоится 04.04.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701**

Победителем аукциона объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику, с его согласия, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона путем перечисления на расчетный счет Организатора суммы этих затрат.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Оплата предмета аукциона производится в белорусских рублях по курсу доллара США к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа, при этом победителю аукциона и единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона, по курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату заключения договора. Другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

**Контакты: +375 (17) 256-61-35 • +375 (25) 549-86-22 • auction@expertiza.by http://www.expertiza.by**

# ЛІЧБАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ІНТАРЭСАХ ДЗІКАЙ ПРЫРОДЫ

**«Аб'ядноўваючы людзей і планету: лічбавыя інавацыі ў ахове дзікай прыроды» — пад такім дэвізам праходзіць сёлета Сусветны дзень дзікай прыроды, які адзначаюць 3 сакавіка. У адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН, прынятай у 2013 годзе, дата заклікана звярнуць увагу на праблемы, звязаныя з аховай прыроды і зьмяненнем клімату.**



Выбар часу значнай падзеі быў невыпадковы. Менавіта 3 сакавіка 1973 года прадстаўнікі 80 краін падпісалі тэкст канвенцыі «Аб міжнародным гандлі відамі дзікай фаўны і флоры, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення» (CITES). Яе мэта — прадухіліць пагрозы выжыванню і забяспечыць ахову больш як 33 000 відам жывёл і раслін. У далейшым колькасць краін-удзельніц CITES значна вырасла і сёння налічвае 184 дзяржавы. Рэспубліка Беларусь далучылася да канвенцыі ў 1994 годзе.

Як расказала на прэс-канферэнцыі **кансультант упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ЖАЛЯЗНОВА**, лічбавыя інавацыі імкліва ўцягваюцца ў сферу экалогіі і аказваюць значны ўплыў на вырашэнне праблем, якія датычацца захавання дзікай прыроды. Напрыклад, серыйная вытворчасць розных лічбавых датчыкаў і спадарожных праграмных прадуктаў зрабіла іх даступнымі і дазваляе атрымліваць на новым якасным узроўні звесткі аб аб'ектах жывёльнага і расліннага свету і аб навакольным асяроддзі. Дроны, фотапасткі, датчыкі сачэння з выкарыстаннем касмічнай сувязі, аўтаномныя падводныя апараты — усе гэтыя сродкі выкарыстоўваюцца падчас правядзення маніторынгаў, улікаў, назіранняў. Больш за тое, дзякуючы ім атрымліваецца ўбачыць тое, што раней было недаступна.

Развіццё і ўцягванне ў вырашэнне самых розных задач, уключаючы экалагічныя, магчымасцяў штучнага інтэлекту ўжо прыносіць практычныя вынікі. У некаторых замежных запаведніках нейрасеткі выкарыстоўваюцца для барацьбы з браканьерствам. Напрыклад, сістэма «Памочнік па абароне дзікай прыроды» на падставе вялізнага масіву даных аналізуе і прадказвае магчымыя паводзіны браканьераў, пасля чаго праланоўвае аптымальныя маршруты патрулявання запаведнай тэрыторыі. Практыка паказала, што выкарыстанне гэтай сістэмы дало магчымасць знайсці і нейтралізаваць у пяць разоў больш пастак, чым удавалася раней.

Генетычныя даследаванні — несумненна актуальны інструмент у справе захавання біяразнастайнасці. Без сучасных тэхнічных сродкаў, праграмных распрацовак тут не абысціся. Вызначэнне відавога складу, выяўленне гібрыдаў, зберажэнне абарыгеннай флоры і фаўны, вывядзенне ўстойлівых да неспрыяльных фактараў відаў — усё гэта сфера генетыкі, якая выкарыстоўвае інавацыйныя тэхналогіі.

Лічбавізацыя ў прыродаахоўнай дзейнасці дазваляе не толькі паскорыць і аблегчыць шматлікія працэсы, але і зрабіць іх больш зразумелымі і празрыстымі. У рамках CITES, дзе вырашаюцца пытанні барацьбы з незаконным гандлем дзікімі жывёламі і іх дэрыватамі, уніфікаваны электронны дакументаабарот садзейнічае выкараненню карупцыі, спыненню спроб парушэння законаў і знаходжання вінаватых.

Сучасныя тэхналогіі, безумоўна, адыгрываюць вялізную ролю ў экалогіі. Але не варта забываць, што гэта ўсяго толькі інструменты, якія можна выкарыстоўваць як на карысць, так і на шкоду. Усё залежыць ад чалавека. Наша агульная задача — зрабіць так, каб лічбавыя інавацыі аб'ядноўвалі і дапамагалі тым, хто выступае за захаванне дзікай прыроды.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ, фота аўтара.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

# КОНКУРС ЗАВЯРШАЕЦЦА... І ЗНОЎКУ ПАЧЫНАЕЦЦА

## Называем імёны пераможцаў конкурсу апавяданняў «Звязды» і абвяшчаем новае творчае спаборніцтва

**Творчае спаборніцтва аўтараў прозы на старонках «Звязды» — даўняя выдатная традыцыя выдання. І яна працягваецца! Сёлета кампетэнтнае журы ў складзе пісьменнікаў, журналістаў Выдавецкага дома «Звязда» зноў падвяло вынікі за мінулы сезон.**

У 2023 годзе на старонках газеты ў рамках конкурсу атрымалі пляцоўку для творчасці 14 пісьменнікаў — жыхароў рэгіёнаў і сталіцы. Кожнага з іх можна лічыць пераможцам, бо публікуем мы найлепшае з таго, што дасылаецца. Апрача таго, апавяданню, якое выйшла на старонках «Звязды» і на сайце выдання, забяспечана ўвага шырокага кола чытачоў. Некаторыя аўтары не першы раз удзельнічаюць у конкурсе — такі творчы імпэт сам па сабе заслугоўвае павагі.

Але надышоў час назваць імёны лаўрэатаў. Усіх іх аб'ядноўвае адказнае стаўленне да слова, руплівая над ім работа, імкненне праз мастацкія вобразы, адметны стыль, выразныя дэталі данесці да чытача свае думкі.

На першым месцы — **Алена Руцкая** з Гродна. Педагог з амаль пяцідзесяцігадовым стажам, заслужаны настаўнік Беларусі, працавала дацэнтам кафедры беларускай літаратуры (цяпер — кафедра беларускай філалогіі) ГрДУ імя Янкі Купалы. Аўтар шматлікіх навуковых прац, кніг паэзіі і зборніка нарысаў. У апавяданні **«Вечар успамінаў»** былыя выпускнікі згадваюць розныя эпізоды са школьнага дзяцінства. І высвятляецца, што самы важны жыццёвы ўрок атрымалі яны каля помніка, пастаўленага на месцы, дзе фашысты расстрэльвалі палонных савецкіх салдат і вязняў гета. Урок памяці... Колькі такіх абеліскаў за 80 гадоў пасля вызвалення Беларусі з'явілася на нашай зямлі! Гісторыя кожнага з іх — тэма для асобнага ўрока памяці. А таму апавяданне Алены Руцкой — пра ўсіх нас.

Другое месца прысуджана **Алесю Бычкоўскаму** за апавяданне **«Адарка»**. Нарадзіўся Алесь Бычкоўскі ў Беразіно Мінскай вобласці, дзе і жыве. Працуе ў рэдакцыі раённай газеты «Бярэзінская панарама». Аўтар шэрагу кніг у жанры фантастыкі. На «звяздоўскі» конкурс пісьменнік прапанаваў твор, цалкам рэалістычны. У цэнтры апавядання — няпростая сямейная калізія, заблытаныя адносіны блізкіх людзей. Адарка вырасла ў нешчаслівай сям'і, але, магчыма, у яе нарэшце з'явіцца шанц на шчасце пасля таго, як раскрылася даўняя сямейная таямніца? І хоць выправіць памылкі мінулага наўрад ці магчыма, але фінал апавядання вельмі светлы і дорыць надзею.

Трэцяе месца атрымала **Ніна Рыбік** з Астраўца за апавяданне **«Вясельны ручнік»**. Ніна Рыбік больш за сорак гадоў аддала журналістыцы, доўгі час працавала галоўным рэдактарам газеты «Астравецкая праўда». Нарадзілася пісьменніца на Хойнікаўшчыне. Аўтар кніг прозы «Свае і чужыя», «Права на адсяленне», «Скрыжаванні», пераможца рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Многія творы Ніна Рыбік прысвяціла беларусам, чыё жыццё закранула сваім чорным крылом чарнобыльская трагедыя. Пісьменніца ўмее расказаць пра драматычныя падзеі так, што баліць і чытачу, — а хіба не ў гэтым прыкмета мастацтва? Не «лёгкае чытво» і ўганараванае апавяданне. З глыбокім псіхалагізмам Ніна Рыбік шукае адказ на вечныя пытанні, расПавядаючы пра лёсы дзвюх сясцёр, Сафеі і Раісы. Жаночы лёс першай з іх паламала вайна, але Сафея аказалася больш мужнай і трывалай, чым малодшая сястра.

**Алена БРАВА.**

**Віншуем пераможцаў! Шчыра дзякуем усім, хто прыняў удзел у конкурсе. А наша творчае спаборніцтва працягваецца! Конкурсны сезон 2024 года адкрыты. Чакаем вашы новыя творы, паважаныя аўтары. Да разгляду прымаюцца апавяданні на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся, аб'ёмам да 10—12 тысяч знакаў (з прабеламі). Даслаць тэксты можна на электронны адрас info@zviazda.by альбо на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013. У тэме пісьма пазначце, калі ласка, «На літаратурны конкурс», не забудзьцеся дадаць звесткі пра сябе (для налічэння ганарару) — сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя.**

Будзьце пільнымі!

# НА БРЭСТЧЫНЕ ПРАЧНУЛІСЯ КЛЯШЧЫ

**У Брэсцкім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя паведамілі, што першыя актыўныя кляшчы былі зафіксаваны ў Камянецкім раёне яшчэ 31 студзеня. А ў першай палове лютага крывасмокі заўважаны ў шэрагу раёнаў вобласці. Надвор'е спрыяе таму, што названыя насякомыя прачынаюцца тут раней, чым у іншых рэгіёнах краіны.**

На працягу мінулага года ва ўстановы аховы здароўя вобласці з укусамі кляшчоў звярнуліся 4166 чалавек, з іх 1453 дзіцяці і падлеткі да 17 гадоў (35 %). Гэта значна больш, чым у 2022 годзе — адпаведна 3382 і 1413.



З даследаваных летась 2385 кляшчоў, знятых з цела чалавека, — 27 працэнтаў мелі ўзбуджальнік Лайм-барэліёзу, 1,3 працэнта былі заражаны вірусам клешчавога энцэфаліту, 14 працэнтаў — іншымі вірусамі.

Больш за ўсё кляшчоў жыве ва ўмерана зацененых ліставых і змешаных лясах, яны любяць вільготнае асяроддзе, а таксама маладыя заraснікі асінніку, маліннік, высечкі, сядзіць уздоўж сцяжын і дарог, дзе пасецца жывёла. Кляшчы цярпліва чакаюць сваю ахвяру. Пры першай магчымасці яны прымацоўваюцца да адзення чалавека. З адзежы і рэчаў здольны перапаўзці на цела нават праз некалькі дзён. Могуць трапіць у жытло з букетамі кветак, венікамі, дровамі, жывёламі.

Спецыялісты яшчэ раз нагадваюць пра меры бяспекі пры знаходжанні на свежым паветры: адзенне, галаўныя ўборы павінны максімальна закрываць цела, пажадана выкарыстоўваць сродкі абароны — рэпеленты. А калі ўкусу не ўдалося пазбегнуць, важна своечасова выдаліць кляшча і звярнуцца да ўрача для прызначэння прафілактычнага лячэння.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Сугучча

# ПЕРАКЛАДЧЫК КОЛАСА СТАЎ НАРОДНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ ЧАЧНІ

**Адам АХМАТУКАЕЎ у нядаўнім часе неаднойчы наведваўся ў Беларусь. Удзельнічаў у розных творчых праектах, якія традыцыйна ладзілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда». Пазнаёміўшыся з беларускімі калегамі-пісьменнікамі, паэт і перакладчык падрыхтаваў і выдаў у Грозным кнігу беларускай паэзіі на чачэнскай мове, дзе разам паяднаў пераўвасабленні твораў класікаў і сучаснікаў. І ў Мінску выйшла кніга паэзіі Адама Ахматукаева на беларускай мове ў серыі «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Перакладчыкам выступіў Міхась Пазнякоў.**



Днямі ў Грозным прынята рашэнне аб наданні паэту, перакладчыку Адаму Ахматукаеву звання «Народны пісьменнік Чачэнскай Рэспублікі».

Па-ранейшаму чачэнскі літаратар уважлівы да беларускай літаратуры, да беларускай паэзіі. За апошні час у чачэнскіх газетах і часопісах з'явілася некалькі публікацый перакладзеных Адамам Ахматукаевым вершаў і нават паэм народных песняроў нашай Айчыны Якуба Коласа і Янкі Купалы. У адказ на віншаванні з Беларусі з высокім званнем, высокай ацэнкай творчасці чачэнскі творца заўважыў:

— Любоў да Беларусі, беларускай літаратуры носіць у мяне бязмежны характар. А што датычыцца перакладчыцкіх памкненняў, то я вылучаю ўвагу да класічнай паэзіі. З асаблівым піетэтам стаўлюся да творчасці Якуба Коласа і Янкі Купалы. Коласаўскія вершы «Родныя вобразы», «Не бядуй!», купалаўскія «Санеты» ўвогуле ўзрушылі мяне, захапілі настолькі, што ўжо і як даследчык я пачаў цікавіцца беларускай літаратурай першай паловы XX стагоддзя.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# «ПАЛЫНОЧАК» БЕЗ ГЭТАГА РУКАВА — ІНШЫ...»

## Штрыхі да партрэта Ларысы Александроўскай

***«Мы ў дні вайны
Бывалі ўсюды разам.
Артыст ў баю суправаджаў байца
Да Брэста і да сініх гор Каўказа
І дальш — да пераможнага канца!
І не састараць ні гады, ні раны
Сяброўства, гартаванае ў баю.
Прывет вам, баявыя ветэраны,
І тым, што ў воінскім цяпер страю!»***

Уверсе гэтага аркушыка, які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, значыцца: «Тэкст Л. П. Александроўскай».

Легендарная спявачка відавочна складала тэкст для песні.

Што ж, тэма вайны была для яе балючай — актрыса цудам выбралася пад бамбёжкамі з Мінска, з сынам, які некалькі дзён таму перанёс аперацыю пасля апендыцыту... Была ў франтавой брыгадзе... А адразу пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыехала ў Мінск, каб прадставіць напісаную ў эвакуацыі оперу пра беларускіх партызан...

У гэтым годзе мы адзначаем юбілей Ларысы Александроўскай — 120 гадоў... Хоць з датай блытаніна, як яна сама пазначыла ў сваіх успамінах — «День своего рождения, год, число, месяц — назову в конце, в самом конце. Когда уже будет все равно».

А гэта да таго, што два гады жыцця Ларысы Пампееўны ў дакументах «згубіліся», нібыта калі выпісвала сабе новыя ў эвакуацыі і «падмаладзілася».

Даследаванняў пра «беларускага салаўя», Ларысу Пампееўну Александроўскую, вельмі і вельмі шмат. Яе пляменніца Арыядна Ладыгіна выдала пра яе цэлую кнігу. Таму давайце проста пагартаем некаторыя дакументы з фонду Ларысы Александроўскай, што захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, і паспрабуем знайсці нейкія новыя штрыхі да партрэта вядомай спявачкі.

Заір Азгур зрабіў яе партрэт у мармуры. *«Натура актрисы подвижная, динамичная, неуемная. А материалом я выбрал мрамор... Думаю, что не ошибся. Ведь кристаллы мрамора иногда — как зерна — таят в себе силы жизни. Если стучать кияжкой по мрамору, то это все равно что прибегать к камертону: сразу обнаружишь фальшь, а она засвидетельствует трещину в камне. Александровская не фальшивила в искусстве».*

Для Заіра Азгура Ларыса Пампееўна была ўвасабленнем ідэалу жаночай прыгажосці. Я сама ў юнацтве ад яго гэта чула, калі давялося патрапіць у ягоную майстэрню — на скульптурным партрэце Александроўскай ён тлумачыў, якія прапорцыі мусяць быць у ідэальнага жаночага цела.

### Барабаншчыца тэрытарыяльнага палка

Перабіраю ўліковыя карткі і анкеты Ларысы Пампееўны. Вось на ўліковай картцы, заведзенай на яе, як на старшыню прэзідыума Беларускага тэатральнага таварыства, у 1946 годзе, яна пазначае веданне замежных моў — французская, нямецкая, украінская, вось у асабістым лістку дэпутата Вярхоўнага Савета БССР пазначае ў графе аб адукацыі — сярэднія школы ў Мінску, Ленінградзе, Архангельску... За ўдакладненнямі звернемся да ўспамінаў Ларысы Александроўскай — рукапіс іх захоўваецца таксама ў БДАМЛІМ. Школьны сшытак



*«Дзяўчынка з Палесся». Алеся*

у лінейку, напісана ў Кіславодску, дата — 6 ліпеня 1947 года. *«Детство: веселая, шумная, поющая, танцующая, играющая, спорящая молодежь — сверстники и сверстницы моих старших сестер и братьев и, вместе с ними, мама, не уступающая ни в песнях, ни в играх, ни в спорах. Балалайка, гитара, мандолина, — много позже — граммофон... Жили почти на окраине города, деревянный домик в три комнаты с кухней, поэтому летом совершались прогулки на линию железной дороги встречать вечерний поезд. Пикники. Иногда поездка на месяц-два в Архангельск к отцу».* Як бачыце, апісаны побыт інтэлігентнай мінскай дарэвалюцыйнай сям'і, і вучыліся дзеці з такой сям'і не ў сярэдніх школах, а ў гімназіях, дзе і засвойвалі добрае веданне некалькіх замежных моў. Бацька Ларысы працаваў на ўпраўленні Лібава-Роменскай чыгункай. Ларыса, пятае дзіця ў сям'і, вучылася ў Мінскай гімназіі, а калі пачалася Першая сусветная вайна і сям'я пераехала ў Пецярбург, davучвалася ў гімназіі тамтэйшай.

Першае, з чаго яна пачынае аўтабіяграфію — з палёту. На дзявяты дзень жыцця Ларыса ўпала з ложка на падлогу. Маці перапалохалася страшэнна... А дзяўчынка нават не заплакала: *«Только поднятая девочка кулачками тёрла свой носик, форма которого так и осталась своеобразно-кокетливо искривленной на всю жизнь. Никто не представлял, что на этот нос не раз будет досадовать Народная артистка СССР, гримируясь в своей уборной перед спектаклем».*

Яшчэ цікавы штрых: калі юная Ларыса кудысьці адпраўлялася, «личный багаж составляли: гитара и кошка, с которыми я не разлучалась».

Давялося Ларысе, калі насталі суровыя паслярэвалюцыйныя гады, спяваць у царкве — у рукапісе Ларыса Пампееўна старанна пазначае ў дужках, што пайшла ў царкоўны хор, бо нічога болей не ўмела. Галасістую спявачку там запрыкмецілі і запрасілі ў тэатр, які потым стаў трупай Галоўлітасветы пры ваенкамаце Заходняга фронту. *«Работала на «марках» и получала пайки при воинских частях, где числились музыкантами, барабанщиками и т. д. Я была зачислена в территориальный полк барабанщиком, выступала как певица в их клубе на концертах и за это получала паёк. Годы были голодные — ничего купить было нельзя, хлеба не хватало, жиров не было, в пайке — подсолнечное масло и мороженая картошка, селедка, вобла — вот я еще и поступила на Подготовительные курсы комсостава переписчицей. Днём в канцелярии, в обед прибежишь домой, чего-то себе сошьешь, туфли подобьешь (на веревочной подошве) и в театр — на спектакль, на концерты».*

Там пачаўся творчы шлях легендарнай спявачкі...

### «Это всё апофеоз»

Энергіі ў яе сапраўды нямерана... Пра што сведчаць нататнікі і штодзённікі, якія захоўваюцца ў БДАМЛІМ. У іх — чарнавікі дакладаў, якія ёй даводзілася часам прыдумляць проста на хаду. Тэзісы таго, што гаварылі іншыя на ўсялякіх з'ездах, пасяджэннях, канферэнцыях, мастацкіх радах. Уласныя заўвагі і ацэнкі. Напрыклад, Ларыса Пампееўна занатоўвае на нейкай канферэнцыі: «По сути имена театров Я. Купалы и Я. Коласа, а где их произведения? «Паўлінка»?» Відавочна, гэта заўвага, што ў тэатрах, якія носяць імёны беларускіх класікаў, не хапае пастановак па іх творах.



БЕЛОРУССКОЕ ТЕАТРАЛЬНОЕ ОБЩЕСТВО
УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА №
1. Фамилия Александровская 2. Псевдоним нет
3. Имя Лариса 4. Отчество Помпеевна
5. Партийность член ВКП(б) с 1942 г. 6. Состоит ли членом ВЛКСМ нет
7. Дата рождения 15 февраля 1904 г. 8. Социальное происхождение
9. Национальность белоруска 10. Основная специальность
11. Звание 13. Адрес места рождения г. Минск
12. Является ли членом профсоюза
14. Занимаемая должность Председатель Президиума Белор. театр. о-ва 15. Место работы Белорусское театральное общество
16. Образование общее среднее 17. Образование специальное

«Театр(альные) программки — визитные карточки: более содержательные, культурные, определяющие смысл спектакля — лицо театра».

«Как можно мириться с тем, что не поймешь — на каком языке актер говорит...»

Нечаканым сталася сустрэць на палях нататнікаў малюнкі. Як многія з нас, Ларыса Пампееўна падчас доўгіх пасяджэнняў нешта крамзоліла. Часцей за ўсё сустракаюцца партрэты — прычым відавочна, што некаторыя намаляваныя з натуры. Ведаць бы яшчэ, хто менавіта намаляваны? Адзін партрэт, напрыклад, самавітай жанчыны ў профіль, нагадвае Уладзіславу Францаўну Луцэвіч, Купаліху... Але гэта толькі домыслы. Ёсць таксама замалёўкі сцэнічных касцюмаў — па стылі яны нагадваюць тыя, у якіх мы звыклі бачыць спявачку, напэўна, для сваіх жа вобразаў і прыдумляла.

А вось чарнавік ліста да спявачкі Соф'і Друкер: *«Сучасны стан майго здароўя, на жаль, не дазваляе мне асабіста прысутнічаць і прыняць удзел у Вашым юбілейным свяце, каб павіншаваць Вас, Соф'я Юр'еўна, Вас, што валодае найлепшым у рэспубліцы голасам сапраўднага драматычнага сапрана з поўным оперным дыяпазонам, багатага па красаце, чароўнага па тэмбру. Жадаю добрага здароўя, бадзёрасці, творчых радасцей і асабістага шчасця».*

На аркушы з заканчэннем віншавальнага ліста — жаночы партрэт алоўкам: вялізныя вочы, характарны нос, шмат эмоцый... Знаходзім фотаздымкі Соф'і Друкер, параўноўваем... Так, падобна! Вочы, форма носа...Так што заслугоўвае ўвагі гіпотэза, што перад намі — выканаены Ларысай Александроўскай партрэт Соф'і Друкер!

А вось цікавая замалёўка, якая датычыцца канцэрта пад назвай «Мы — беларусы», які, магчыма, адбыўся ў Маскве. У правым верхнім куце жаночы твар у вяночку, аркуш запаўняюць шматлікія рысачкі-хвалі: ці гэта галовы публікі ў зале, убачаныя з ложы, ці так перадаецца творчы імпэт дзеяння? Угадваецца маленькая постаць жанчыны з крыламі і надпіс: «Это всё апофеоз».

А вось запісы, якія сведчаць пра клопат Александроўскай, дырэктара тэатра оперы і балета і старшыні Беларускага тэатральнага таварыства, пра сваіх артыстаў. Нататкі, якія датычацца вылучэння жылплошчы: «13 м — сыновья на кухне, мать. За стенкой — освободилась квартира Рощиной... Мать-пенсионерка, живут с 3-мя детьми».

А вось «Дзелавы каляндар» 1969 года. Тут і накіды чарговага даклада пра тэатр, і рэцэпты на лекі — спявачка ўжо ва ўзросце, здароўе здае. І ледзь не штодня — нейкія мерапрыемствы, на якіх трэба прысутнічаць. Красавік, 21-га, а 17.00 — «ЦДРИ. Встреча кавалеров ордена Ленина». 23-га — «Выехалі на III з'езд эстонскага тэатральнага мастацтва». А назаўтра пазнака: 11.40 — «Оперный Михеева худсовет». 29-га красавіка — «адкрыццё музея ў тэатры оперы і балета». Запісы пра канцэрт у Ленінградзе: «Самолет Ту-124 в 10.30. 16 часов. Дом ветеранов сцены. Концерт — хорошо как всегда — трогательно, приятно, трепетно (выступала я)». Гартаем далей... Старонка за суботу 17 мая: «На кладбище — цветы Григонасу, Глебову, Крыловичу, Платонову, Мировичу, маме, Васе, Лиде, Ф. В., Кларе». Наступны дзень — «В Доме искусств вечер памяти Г. П. Глебова. Фестиваль музыки Монюшко — 150-летие со дня рождения. Закрытие — во Дворце спорта. Выступила».

Ларыса Александроўская была адной з нешматлікіх абраных, хто прадстаўляў мастацтва Савецкага Саюза за мяжой, удзельнічаў у рабоце міжнародных арганізацый. Яшчэ ў 1920-х Александроўская з калегамі ездзіла на Міжнародную музычную выставу ў Германію і Швецыю, у 1945-м была дэлегаткай 1-га Нацыянальнага кангрэса французскіх жанчын, стала сябрам Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын... Пра міжнародныя стасункі сведчаць і нататкі, дзе Александроўская накідвае тэзісы сваіх выступленняў: «От народов Советского Союза — народу Австрии в нашем общем деле, борьбе за мир — дружеский братский привет! Мы рады, что приехали в Вену...» «Мир может быть спасён, мир должен быть спасён». «Зал Моцарта — встреча женщин-делегатов с женщинами Австрии — подарки».

### «Ніякае гэта не прыкрашальніцтва!»

Так, характар у яе быў моцны... Заір Азгур успамінае, як у 1939 годзе, калі рыхтаваліся да Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, параіў спявачцы выступаць у цёмнай канцэртнай сукенцы з аксаміту — бо этнаграфічна-музейны ўбор перашкаджаў скульптару засяродзіцца на спевах. «Я тады быў перакананы, што песня не мае патрэбы ў арнаменталістыцы, ва ўпрыгожванні і ілюстрацыі». Александроўская, ні на імгненне не засумняваўшыся, адказала даволі рэзка:

*«—Я павязу ў Маскву вялікую канцэртную праграму. Я хачу паказаць песню такой, якой яна жыве ў народзе. У яе ёсць свой убор. Не прыдуманы, не прадыктаваны модай, шаноўны Заір, а самой прыродай, самой гісторыяй усталяваны. Так, з вышыўкамі! З арнаментам. З узорам. Ніякае гэта не прыкрашальніцтва! Мой убор — гэта працяг песні... Разумееце! Іначай цяжка раслумачыць, але гэта менавіта так: працяг песні... «Палыночак» без гэтага рукава — іншы, у яго няма тады, калі хочаце ведаць, першароднасці...»*

Азгур лічыць паказчыкам свабодалюбства і моцы характару Александроўскай, што яна са сваім сапрана дамагалася права выконваць партыю Кармэн, якую звычайна аддаюць меца-сапрана. Тады ўвесь тэатральны свет падзяліўся на прыхільнікаў і зайздроснікаў спявачкі...

Шмат хто з беларускай творчай інтэлігенцыі быў зачараваны асобай і талентам Ларысы Пампееўны. У яе архіве — шмат лістоў ад вядомых асоб. Напрыклад, ліст 1941 года ад Якуба Коласа, адпраўлены ў эвакуацыі. Колас знаходзіўся ў Ташкенце, Александроўская — у Алма-Аце.

*«Милая Лариса Помпеевна! Очень обрадовали Вы меня весточкой о себе. Рад за вас, что Вы не без дела, что можете работать. К сожалению, о себе этого сказать не могу. Сейчас я занимаюсь делом, очень далеким от искусства. Впрочем, быть может, это и не совсем верно, так как и кулинария тоже требует и мастерства и таланта... Нет, я не шучу. Жена заболела воспалением легких, лежала в больнице, а затем ее преждевременно выписали, она снова заболела, а мне пришлось заменить ее. Живу в маленькой комнате на окраине, но на днях переезжаю ближе к центру. Заработки мои очень скромны, кое-что пишу, в местной прессе помещаю. Персональной пенсии, депутатского жалованья и проч. не получаю. Здесь из числа моих коллег одна лишь Эди Огнецвет. Письма идут долго, и мало кто отвечает на них, как, например, Янка.»* (Напэўна, маецца на ўвазе Янка Купала.)

Па гэтым лісце адчуваецца, як раскіданыя па краіне навалай вайны беларусы цягнуліся адзін да аднаго, спрабавалі нешта даведацца пра сваіх... І яшчэ адзін цікавы артэфакт, які сведчыць пра эпоху: тэлеграма-віншаванне з новым 1942 годам. Адпраўленая зноў з Ташкента ў Алма-Ату, Якубам Коласам — Александроўскай. Тэкст звычайны: «Поздравляю с новым годом, желаю здоровья». Незвычайная сама тэлеграма: стужкі з тэкстам наклееныя на старонкі жывёлагадоўчай справаздачы, дзе расказваецца пра ўтрыманне кароў. Папера была дэфіцытам... Пра што сведчыць і тое, што аркушык з тэлеграмай выкарыстоўвалі для нейкіх разлікаў: у правым ніжнім куце алоўкам напісаныя лічбы, магчыма, лічыліся грошы.

Азгур успамінае незабыўны вечар: калі ў час вайны беларуская

інтэлігенцыя сабралася ў Маскве, у нумары гасцініцы «Якар», Александроўская ўвесь вечар спявала для сваіх гасцей тое, што выконвала для байцоў на фронце. Напрыклад, песню на верш Васіля Віткі з цыкла «Горкі вырай», на верш Анатоля Астрэйкі «На скрыжаванні». Расчульваліся, плакалі...

## Гераічная «Алеся»

Асобная адзінка захавання ў фондзе прысвечана рукапісам Александроўскай з нагоды юбілеяў оперы «Дзяўчына з Палесся». Рукапісаў некалькі — да 10-годдзя, да 20-годдзя, напісаныя для розных выданняў... Опера незвычайная, бо нарадзілася ў часы вайны. Давайце ўчытаемся ў адзін з рукапісаў... Радкі алоўкам у школьным сшытку ў лінейку...

*«Коллектив нашего театра нашел братский приют и дружбу советских людей, находясь далеко от своих родных мест, своих близких, своей работы. Вся наша жизнь была посвящена общему делу разгрома врага. В тесной дружбе с писателями, поэтами, композиторами создавались новые песни на тему дня. Бригады артистов исполняли их на передовых, в госпиталях, на заводах, фабриках. Родилась мысль — создать оперу о героических буднях простых советских людей, их самоотверженной борьбе в тылу врага. Партизанское движение росло — газеты приносили факты славных подвигов верных дочерей и сыновей белорусского народа. В горячих творческих спорах родилось либретто оперы, музыку к ней взялся писать народный артист БССР Тикоцкий. Помню день, когда враг ожесточенно бомбил г. Горький, где работал в то время наш коллектив. В течение 20 дней регулярно мы уходили в бомбоубежище. И вот там, в углу, глубоко под землей, при тусклом свете, примостившись на скамейке с кипой нотной бумаги — Тикоцкий в то время, как наверху рвались фашистские бомбы — писал музыку о победе советских людей, о разгроме фашистов, героике партизан и партизанок Белоруссии. Это был 1942 год».*

Калі ў ліпені 1944 года быў вызвалены Мінск, тэатр вярнуўся на радзіму. Александроўская ўспамінае: *«Здание театра было разбито, город был сожжен, не было жилья, не было воды, не было света, не было дров... Театральный коллектив дружно включился в работу по восстановлению города, театра. И вот через два с половиной месяца на сцене Дома Красной армии — изголодавшийся, истосковавшийся белорусский зритель услышал вновь своих певцов, танцоров, музыкантов: была показана опера Е. К. Тикоцкого «Дзяўчына з Палесся»... Трудно передать восторженный прием, искреннее чувство наших слушателей, переполнивших зрительный зал».*

Урывак з другога рукапісу: *«Не вся Белоруссия еще была свободна, еще рядом шли бои, а в столице — Минске уже шла опера о победе советского народа».*

Опера гэтая нам больш вядомая пад назвай «Алеся». «Дзяўчынай з Палесся» яна стала на пачатку 1950-х, калі ў мастацтве паўсюль вышуквалі ідэалагічныя хібы, і нават опера Цікоцкага была названая антынароднай. Гэта не перашкодзіла «Алесі» — «Дзяўчыне з Палесся» працягнуць творчую біяграфію. Дарэчы, аўтар лібрэта — Пятрусь Броўка. Опера шмат разоў дапрацоўвалася, было пяць рэдакцый.

Першай выканаўцай ролі Алесі была Ларыса Александроўская.

*«Так, яна заслужана была любімая народам, — сцвярджае Заір Азгур. — І мы, мастакі, увекавечваючы яе аблічча ў мармуры ці бронзе, на жывапісным палатне ці ў графічным выяўленні, павінны памятаць, што праз гэтае аблічча выяўляем і нашу Беларусь».*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Дэкадансны карнавал між трох сёстраў

## Прэм'ера ў тэатры імя М. Горкага



Тры сястры Чэхава імкнуцца ў адзін горад.

Тры сястры Леаніда Андрэева кахаюць аднаго мужчыну.

Але сімваліст Андрэеў не Чэхаў, і любая побытавая гісторыя ў яго — гэта ўсяго толькі канва экзістэнцыяльных росшукаў, любая постаць, падзея і прадмет — толькі сімвал, а прастора ўсяе дзеі — чалавечая душа... Карацей, можна вольна паглыбляцца ў падтэксты філасофіі панпсіхізму — тэрмін, прыдуманы Андрэевым, згодна з гэтай філасофіяй, ва ўсяго ў свеце ёсць душа, і ўвесь свет — душа. Можа, таму рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Валянціна Еранькова і абрала для пастаноўкі паўзабытую п'есу Леаніда Андрэева «Анфіса». Твор, які адсылае да эпохі дэкадансу, сімвалізму, ар-нуво, калі Станіслаўскі ставіў Метэрлінка, Ібсэна, Гаўптмана, таго ж Андрэева... Менавіта атмасфера таго часу паўплывала на Янку Купалу, які вучыўся ў Пецярбургу і задумваў паэму-містэрыю «Сон на кургане».

Да таго часу адсылае і сцэнаграфія Алы Сарокінай у спектаклі «Анфіса», здача якога адбылася 24 лютага, а прэм'ера 25 лютага. Тыя, хто любіць эпоху дэкадансу, атрымалі сапраўднае задавальненне. Старасвецкія люстры, якія нібыта пакрытыя павутою і адначасова нагадваюць карэнні... Аплеценыя ссохлым блюшчом балюстрады і мармуровыя вазы... Белыя пакрывалы-саваны, паціна і чарната буцвення... Вытанчаныя касцюмы ў стылі эпохі ад мастака Таццяны Лісавенка, дзе можна ўгледзець шмат цытат. Напрыклад, калі з'яўляецца сямейная пара Аносавых (Іна Савянкова і Дзяніс Нямцоў) — выпрастаныя ўрачыстыя постаці ў залацістых цюрбанах, размераная, аўтаматычная гаворка — успамінаюцца і партрэты венецыянскіх дожаў, і загадкавы партрэт ван Эйка сямейнай пары Арнальфіні. Містычная, нават трохі інфернальная постаць Бабулі (Кацярына Шатрова, Аксана Лясная) — сведкі, а можа галоўнага рухавіка ўсіх сямейных жарсцяў — таксама адсылае да вобразаў дэкадансу, бязлітасных маўклівых язычніцкіх багінь. Некалькі сцэн — выдатныя сюррэалістычныя кліпы, якія



нагадваюць: тое, што адбываецца з героямі, нельга трактаваць наўпрост. Навагодняя тэма і песенька пра ёлачку інтэрпрэтуюцца, як у мемах-дэматыватарах, з сюррэалізмам і чорным гумарам... Асабліва ў сцэне віншавання Бабулі вясёлымі гасцямі — жанчыны ў недарэчных «зае́чых» шапачках з доўгімі вушамі, калядная зорка, маскі венецыянскага карнавалу, німбы, якія пагойдваюцца над галовамі, дзіўна зменeная мелодыя дзіцячай песенькі (згадаю, што выдатнае музычнае афармленне спектакля стварыў Аляксей Еранькоў)...

Леанід Андрэеў, дарэчы, даказваў, што вось гэтая п'еса ў яго «без стылізацыі» — за словамі майстра адчуваецца горкая крыўда на ўвесьчасныя папіканні ў фармалізме. Пісьменнік трохі хітрыў. Вядома, калі вылушчыць з п'есы голы сюжэт, — адвакат Фёдар Кастамараў (Аляксандр Гіранок) круціць раманы з дзвюма сёстрамі жонкі (Вольга Здзярская і Елізавета Гаўрылава), у той час як яго жонка (Вераніка Пляшкевіч) чакае дзіця — гісторыя атрымліваецца непрыгожая (п'есу таму і не ставілі доўгі час). Але можна і ўспрымаць гэта, як сімвалічную гісторыю пакутлівых пошукаў чалавечае душы, якой няма спакою, якая змагаецца з унутраным зверам. Тры сястры — што падкрэсліваецца іх касцюмамі — тры іпастасі жаноцкага пачатку, Анімы. Аляксандра — захавальніца агменю, Маці, Анфіса — Муза, жрыца, жарсць і пакута, Ніна — Дзяўчына, чысціня, цнатлівасць, дзіцячая гарэзнасць. У кожнай іпастасі ёсць цёмны бок — таму што ніводная не можа стаць адзінаасобнай уладальніцай душы героя, і таму яго лёс — смерць. Бо і ён не можа выбраць паміж гэтымі іпастасямі, кідаецца ад Маці — да Музы — да Дзяўчыны... А ёсць яшчэ і Бабуля, увасоблены Фатум, якая пляце, пляце, пляце сетку лёсу. У фінале, зрэшты, даецца намёк — усё, што адбываецца на сцэне, і ёсць гісторыя жыцця тае Бабулі, састарэлай Анфісы, інтэрпрэтаваная як снабачанне — бо жыццё ж ёсць сон...

Спектакль — спроба замахнуцца на нязвыклую стылістыку, задача надзвычай цяжкая і амбіцыйная. Можна толькі ўявіць, колькі працы, душэўных сіл давялося затраціць усім стваральнікам і, вядома, артыстам. І Аляксандру Гіранку, які ў гэтай вялікай драматычнай ролі (а мы ж звыклі да яго камічных персанажаў), здолеў вырашыць амаль непад'ёмную задачу: яго герой, нягледзячы на ўчынкі, не выклікае агіды, за ім хочацца сачыць, адчуваецца неверагоднае напружанне яго ўнутранага жыцця. А якое напружанне, колькі падтэкстаў хаваецца за дыялогамі дзвюх сясцёр, Аляксандры і Анфісы, — Веранікі Пляшкевіч і Вольгі Здзярскай — і, дарэчы, у п'есе Андрэева гэта не прапісана. Сяргей Жбанкоў пераканаўча стварыў свайго персанажа — адвакат-вегетарыянец Татарынаў, «правільны» чыноўнік, які верна служыць таленавітаму сябру з цяжкім характарам. Адпавядае роля грубаватага блазна, «трыкстара» Разенталя і Алегу Коцу, пра што сведчыць смех гледача.

Магчыма, не ўсе расчытаюць філасофскія падтэксты. Але авацыі, якія ўчыніў глядач пасля прэм'еры, сведчаць — зачапіла, узрушыла, здзівіла нечым новым, нязвыклым. Дарэчы, спектакль чамусь названы меладрамай (хоць драмы тут болей), акцэнт — што гэта «пра каханне»... Вядома ж, пра каханне, але галоўным чынам — пра тое, якое яно рознае. Старажытныя грэкі налічвалі некалькі яго відаў, якія ў розных спалучэннях утваралі яшчэ і новыя віды. Эрас — каханне жарснае і фізічнае, каханне-жаданне, як у кавалера дэ Грые і Манон Ляско, людус — каханне-гульня: заваяваць, прыўлашчыць, уцерці нос сапернікам. Сторге — каханне-пяшчота, каханне-клопат. Братэрскае платанічнае filia... Калі з'ядноўваецца эрас і людус, утвараецца каханне-манія, пакаранне багоў. Калі на эрас накладаецца сторге — узнікае агапэ... Самаахвярнае, шчырае пачуццё. А людус плюс сторге — ужо прагма. Каханне па разліку. Усе гэтыя віды кахання можна знайсці ў п'есе Леаніда Андрэева. Паспадзяёмся, што і глядач, які прыйдзе на спектакль «Анфіса» ў тэатр імя М. Горкага, адкрые для сябе не толькі сумную гісторыю няшчаснай сям'і, але і захопіцца разгадваннем сэнсаў і сімвалаў, атрымае асалоду ад вытанчана-сюррэалістычнай атмасферы, а пасля, як нам, яму захочацца абмяркоўваць убачанае, звяртацца да першакрыніц, што сведчыць — тэатральная падзея атрымалася!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота прадастаўлены тэатрам.**

Вернісаж

# Усмешка Гагарына, якая аб'яднала свет



**Юрый Аляксеевіч Гагарын — легендарная асоба. Значэнне яго подзвігу выходзіць далёка за межы першага палёту ў космас. У той няпросты час гэты прарыў аб'яднаў людзей па ўсім свеце, дапамог ім адчуць сябе адзіным цэлым, нягледзячы на геапалітычныя рознагалоссі. Дарэчы, менавіта ў Беларусі рабілася вельмі шмат дзеля таго, каб гэты палёт адбыўся. 9 сакавіка 2024 года споўніцца 90 гадоў з дня нараджэння першага касманаўта. У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў да гэтай знамянальнай даты адкрылася міжнародная выстава «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для міру».**

— Гэты праект, без усялякага перабольшання, стане лёсавызначальным. Таму што рух да міру не проста аднаго чалавека, а сотняў і тысяч людзей абавязкова прынясе той шчаслівы мір без усялякіх канфліктаў, які мы чакаем і ў якім жадаем жыць, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Сяргей КРЫШТАПОВІЧ** на адкрыцці мерапрыемства.

У сваю чаргу **намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў па творчай рабоце Алеся ІНАЗЕМЦАВА** дадала, што гэта выстаўка — чарговы напамін суайчыннікам і ўсяму свету аб тым, што Гагарын быў першым, нягледзячы на тое як зараз інтэрпрэтуецца гісторыя асваення космасу.

— Вельмі шмат добрага было зроблена ў той няпросты час дзякуючы асабістаму абаянню Гагарына, яго знакамітай усмешцы, якую памятаюць ва ўсім свеце, — дзеліцца намеснік дырэктара. — Гэтым праектам мы хацелі паказаць, што ўсмешка — яна ва ўсе часы, нават у самыя складаныя перыяды, можа вырашаць вельмі шмат.

Маштабная экспазіцыя ўключае тры асноўныя складнікі. Першы — фатаграфіі Юрыя Гагарына, зробленыя на мерапрыемствах рознага ўзроўню: ад афіцыйных да сямейных. Таксама на выставе можна ўбачыць і сапраўдныя асабістыя рэчы касманаўта. У асобнай зале прадстаўлены даміно, ліхтарык і складны нож. Яны з'явіліся на выставе дзякуючы Аб'яднанаму мемарыяльнаму музею-запаведніку Ю. А. Гагарына і асабістаму архіву пляменніцы касманаўта.

Другі складнік — работы, якія былі вылучаны ў працэсе адкрытага адбору.

— Любы жадаючы мог даслаць работу на тэму міру, палёту, космасу і, вядома, асобы Юрыя Гагарына, — дзеліцца Алеся Іназемцава. — Вельмі шмат твораў прадстаўлена: больш за 100. І я шчыра здзіўленая і ўзрадаваная тым, што адгукнулася практычна ўся краіна, а таксама расійскія рэгіёны ад Сочы да Новасібірска.

А вось трэці складнік экспазіцыі — гэта міжнародная акцыя «Усмешка для міру», якая праводзіцца пры садзейнічанні Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Гэта фатаграфіі людзей з усяго свету, якія вырашылі таксама далучыцца да святкавання юбілею касманаўта. Яны дэманструюцца на экране падчас экспазіцыі. Па словах Сяргея Крыштаповіча, да акцыі ўжо далучылася 36 краін.

— Запусціўшы яе, мы хочам уключыць усю сусветную супольнасць, каб людзі дасылалі свае фатаграфіі на фоне помнікаў Юрыя Гагарыну, з музеяў, прысвечаных касманаўтыцы і космасу. Каб яны, фатаграфуючыся і ўсміхаючыся, давалі б вось гэты імпульс міру, надзеі і перамогі над усімі дэструктыўнымі палітычнымі працэсамі, — заявіў дырэктар цэнтра.

Падчас праекта запланавана вельмі шмат святочных мерапрыемстваў для дзяцей і дарослых. Гэта тэматычныя экскурсіі, майстар-класы, лекцыі і круглы стол. Акрамя таго, паводле слоў Сяргея Крыштаповіча, ёсць вялікая надзея, што адбудзецца прамое ўключэнне з арбіты з нашай беларускай касманаўткай Марынай Васілеўскай.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Центр Промышленной Оценки

- ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
- ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении, расположенные по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69-1**

| Лот № | Наименование | Год выпуска | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 1927701 г/н АС 0213-7** | 2014 | 200382 | **22 752,04** |
| 2 | **VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277 г/н АС 8176-7** | 2014 | 200085 | **24 468,20** |
| 3 | **VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01 г/н АР 8243-7** | 2014 | 200195 | **21 900,29** |

**Дополнительная информация по лотам: потенциальным покупателям рекомендуется перед участием в аукционе уточнить в органах ГАИ порядок постановки автомобилей на учет (ранее автомобили использовались для инкассации и перевозки ценностей)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**. УНП 191 021 390. **Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на валютные счета, указанные на сайте организатора аукциона**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.12.2023

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.03.2024 г. с 10.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.03.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29)-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **КУП «МИНОБЛАВТОСЕРВИС»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

Аукцион состоится **03.04.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1:** ГОЛАЗ-52911,
кузов (рама) № VS2K4X20001848408.
Начальная цена с НДС 20 % – 11 280,00 руб.

**Лот № 2:** TOYOTA LAND-CRUISER,
кузов (рама) № JTEBU29J005148250.
Начальная цена с НДС 20 % – 71 859,90 руб.

**Лот № 3:** TOYOTA LAND-CRUISER 120,
кузов (рама) № JTEBU29J005144716.
Начальная цена с НДС 20 % – 64 208,22 руб.

**Место нахождения Лотов №№ 1–3**: г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Молочный Мир» (Щучинский филиал)**

**Аукцион состоится 19.03.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-3647 (назначение – здание специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности, внутренних дел, наименование – казарма), общей площадью 2033,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-27534 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – сооружение благоустройства к зданию № 35), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, сооружение благоустройства к зданию № 35;<br>- зеленые насаждения (береза, инв. № 01900014701, каштан, инв. № 01900014702).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000123, площадью 0,3077 га (назначение – для содержания и обслуживания здания казармы) по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35 |
| **Начальная цена продажи** | 28 836 руб. (двадцать восемь тысяч восемьсот тридцать шесть рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 883 руб. (две тысячи восемьсот восемьдесят три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 15.03.2024 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.12.2023 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

---

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025, площадью 0,2478 га**

| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 63 500,00 | **Размер задатка, руб.** | 6 350,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», Брестская обл., Брестский р-н, район п. Берестье, тел./ф. 80162 94 13 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 21 марта 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 20 марта 2024 г. до 17.00**

---

*29.02.2024 в газете «Звязда» № 43 (30177)* УНП 600013209
ООО «Фрондера» было размещено извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», назначенного на 03.04.2024.

Лот № 2 расположен на земельном участке, предоставленном на праве постоянного пользования. Планируется переоформление земельного участка **на праве аренды с последующим выделением доли в праве 5/100.**

---

**ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Будкова К.В. извещает о проведении 14 марта 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9**

**ПОЛНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 17 лотов (№№ лотов 1–6, 8–18) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.11.2023 г. № 220 (30100)**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **04 марта 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12 марта 2024 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ЗАО «АТЛАНТ»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 26.03.2024 в 14.00.**

**Лот № 1:**
**1. Квартира № 2а** с инв. № 110/D-2767185, общая площадь – 102,7 кв. м;
**2. Охранная сигнализация** с инв. № 471210.

**Адрес:**
Брестская обл., г. Барановичи, б-р Бородинского, 4-2а.

**Начальная цена продажи** – 108 611,84 руб., в т. ч.: квартира с инв. № 110/D-2767185 – 107 700,78 руб. без учета НДС; охранная сигнализация с инв. № 471210 – 911,06 руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток** – 10 000,00 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать) рабочих дней после утверждения протокола о результатах электронных торгов.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012780290010 0000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 22.03.2024 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# БЕЗ ПАМЯЦІ

## Як палепшыць кровазварот і работу галаўнога мозгу



**Мозг — камандны цэнтр, які кіруе ўсім нашым целам. Ад яго дзейнасці залежыць работа мышцаў, унутраных органаў і, вядома, найвышэйшыя псіхічныя працэсы — памяць, увага, мысленне, маўленне. Галаўны мозг кіруе нашымі здольнасцямі рухацца, дыхаць, есці, выконваць любыя дзеянні, думаць, вучыцца. Літаральна ўсе працэсы жыццядзейнасці кантралюе гэты дасканалы біялагічны камп'ютар. У сваю чаргу, функцыянаванне самога мозгу шмат у чым вызначаецца яго кровазабеспячэннем. На жаль, пад уздзеяннем некаторых фактараў (узрост, захворванні, стрэсы) мазгавы кровазварот можа пагаршацца. Ці ёсць спосабы яго палепшыць і як гэта зрабіць? Ці можна натрэніраваць мозг як мышцы і якія практыкаванні для гэтага раяць нейрабіёлагі? Без якіх вітамінаў мозг не можа абысціся? І як на яго ўплывае алкаголь? Якія новыя факты пра наш мозг нядаўна высветлілі вучоныя? Пра гэта расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГАРБАННІДЖАД.**

— У цяперашні час людзі з узростам усё менш і менш выкарыстоўваюць магчымасці свайго мозгу. Лічыць мы пачынаем з дапамогай калькулятара, інфармацыю шукаем у інтэрнэце. Гаджэты, розныя механізмы, якія ўплываюць на нашы пачуцці, калі глядзім кароткія відэа ці карцінкі і смяёмся ці плачам, замест таго, каб аналізаваць, што адбываецца вакол, спрыяюць таму, што мы ўсё менш і менш выкарыстоўваем свой мозг. А з узростам мазгавая дзейнасць пагаршаецца яшчэ і па аб'ектыўных прычынах. Зрабіла свой «унёсак» пандэмія COVID-19, якая таксама моцна паўплывала на псіхічнае здароўе чалавека і пагаршэнне памяці. Атрымліваецца, што людзі пачынаюць туга цяміць.

**«Дапамагае трэніраваць мозг чытанне, але ўслых. Прычым так, каб чуць свой голас. Калі мы чытаем кнігу ўслых, адначасова працуе некалькі цэнтраў галаўнога мозгу і яны пачынаюць разам камбінавацца. Мозг павінен бачыць, чытаць і адначасова слухаць. Калі некалькі цэнтраў дзейнічаюць разам, галаўны мозг пачынае працаваць лепш».**

***— Чаму мазгавая дзейнасць пагаршаецца менавіта з узростам? З чым гэта звязана?***

— Калі выключыць захворванні Альцгеймера і старэчай дэменцыі, з узростам, па-першае, у нас пагаршаецца кровазварот галаўнога мозгу — змяняюцца сценкі сасудаў, з'яўляюцца атэрасклератычныя бляшкі, і наш мозг горш сілкуецца. Змяненні сасудзістай сценкі праяўляюць сябе шумам у вушах, галаўнымі болямі, гэта сведчыць, што пагаршаецца мазгавы кровазварот.

Па-другое, мы ўсё менш выкарыстоўваем свой мозг па розных прычынах, і ўсё гэта вядзе да таго, што ён ператвараецца ў тлушч, а мы горш і горш запамінаем, забываем, што хацелі зрабіць, і інш.

Спадзявацца на чароўную таблетку не варта. Прэпараты, вядома, могуць палепшыць сітуацыю, але адным імі не абысціся. Павінен быць комплекс мерапрыемстваў, якія дапамогуць як прафілактаваць узроставыя наступствы, так і крыху аднавіць здольнасці, калі яны пачалі страчвацца.

***— Што для гэтага трэба рабіць?***

— Самае галоўнае — палепшыць кровазварот у вобласці патыліцы. Гэтая вобласць самая адчувальная для галаўнога мозгу частка, і з узростам там пагаршаецца кровазварот. Адпаведна пагаршаецца наша памяць.

Як вядома, любое практыкаванне, якое мы выконваем, узмацняе сэрцабіццё, паляпшае кровазварот, у тым ліку ў галаўным мозгу. Вучоныя шукалі, якое практыкаванне паляпшае кровазварот менавіта ў вобласці патыліцы. Прафесар Байлі з Вялікабрытаніі высветліў, што самае аптымальнае — прысяданні.

Калі на працягу 48 гадзін чалавек усяго тры хвіліны папрысядае, гэтага дастаткова, каб палепшыць кровазварот. Такім чынам, кожныя два дні можна рабіць гэта практыкаванне цягам толькі трох хвілін. Прычым яно не толькі паляпшае кровазварот у патыліцы, але і змяншае рызыку ішэмічнага інсульту ў галаўным мозгу.

Як ні дзіўна, калі падчас прысяданняў рабіць любую разумовую працу — рашаць задачку, успамінаць табліцу множання ці проста слухаць музыку, кровазварот павялічваецца яшчэ на пяць працэнтаў.

Людзі з хворымі суставамі ці пазваночнікам, якія не могуць прысядаць, могуць рабіць нахілы. Самае галоўнае — працаваць супраць сілы прыцяжэння, калі фізічна немагчыма рабіць прысяданні. Практыкаванні з нахіламі і паваротамі галавы павышаюць эластычнасць



крывяносных сасудаў, якія сілкуюць мозг, выклікаюць іх пашырэнне. Усё гэта разам з рытмічным дыханнем праз нос павялічвае прыток кіслароду да клетак мозгу, паляпшае разумовую працаздольнасць.

Акрамя практыкаванняў, ёсць розныя прэпараты для паляпшэння мазгавога кровазвароту. Тут трэба парайцца з доктарам, які абярэ найбольш падыходныя. Але без практыкаванняў ад таблеткі эфектыўнасці не так шмат.

**«Даўно вядомы добры ўплыў на арганізм медытацыі. Сучасныя даследаванні нейрабіёлагаў паказваюць, што медытацыі ствараюць новыя нейронныя сувязі ў нашым галаўным мозгу і паляпшаюць памяць».**

***— Аднак, здаецца, палепшыць кровазварот недастаткова. Трэба яшчэ трэніраваць і сам мозг, ці не так?***

— Нейрабіёлагі рэкамендуюць розныя практыкаванні, асабліва калі чалавек з узростам перастае займацца разумовай працай. Адно з іх, напрыклад, закрыць вочы і ўявіць карту свайго раёна: дэталёва разабраць, дзе якія вуліцы, колькі дамоў, паваротаў. Калі гэта занадта лёгка, узяць суседні раён. А потым адкрыць карту і паглядзець, наколькі ўгадалі. Ці ўявіць карту Беларусі: намаляваць, дзе знаходзяцца сталіца і абласныя гарады, якая адлегласць паміж імі, дзе гарады меншыя і інш. Потым адкрыць карту і паглядзець, наколькі яна супадае. Такім чынам мы трэніруем свой мозг.

Гэтак жа, напрыклад, калі кіруем машынай і едзем звычайнай дарогай, можам адначасова запамінаць дэталі: дзе які дом знаходзіцца, дзе — павароты, колькі спячых паліцэйскіх, дзе якія таблічкі і інш., а не проста ехаць, слухаючы музыку. А на зваротным шляху паглядзець, што мы запомнілі. Такім чынам мы можам трэніраваць мозг, праўда, пры гэтым важна не парушаць правіл дарожнага руху.

Яшчэ нейрабіёлагі прапануюць вучыцца нечаму новаму. Напрыклад, запампаваць новы дадатак у камп'ютар і разабрацца, як з ім працаваць. Ці ўзяць нейкае новае абсталяванне, той жа фотаапарат, і навучыцца фатаграфаваць. Жанчыны могуць займацца вышываннем. Можна асвойваць новы музычны інструмент, вывучаць замежныя мовы. У рэшце рэшт дастаткова любога новага хобі. Галоўнае — крыху адцягвацца ад таго, што мы робім штодзень, і дадаваць новае. І на гэтым не спыняцца, потым яшчэ і яшчэ дадаваць.

Акрамя таго, нейрабіёлагі рэкамендуюць памяняць рабочую руку. Калі вы праўша, паспрабуйце штосьці зрабіць левай рукой і наадварот. За сняданкам вазьміце лыжку ў супрацьлеглую руку, ёй жа пачысціце зубы, расчашыце валасы, пішыце ці малюйце ёй. Самае галоўнае, каб гэта было бяспечнае дзеянне — з нажом такіх эксперыментаў рабіць не трэба.

Аказваецца, чым больш кантактныя людзі, тым менш верагоднасць дэменцыі. Разам з равеснікамі можна займацца нейкімі карыснымі грамадскімі справамі, сумесным спортам, калі пажылыя людзі разам выконваюць практыкаванні, удзельнічаць у дабрачынных справах, дапамагаць інвалідам, удзельнічаць у групе, якая займаецца азеляненнем горада, ці пасадзіць кветкі на клумбе каля свайго пад'езда. Такое кантактаванне стварае новыя нейронныя сувязі ў галаўным мозгу і трэніруе памяць. Аднак гэта павінны быць пазітыўныя справы, абмеркаванне суседзяў на лаўцы перад пад'ездам не паляпшае памяць, выбірайце дзеянні, якія прыносяць станоўчыя вынікі і эмоцыі.

Даўно вядомы добры ўплыў на арганізм медытацыі. Сучасныя даследаванні нейрабіёлагаў паказваюць, што медытацыі ствараюць новыя нейронныя сувязі ў нашым галаўным мозгу і паляпшаюць памяць.

Дапамагае трэніраваць мозг чытанне, але ўслых. Прычым так, каб чуць свой голас. Калі мы чытаем кнігу ўслых, адначасова працуе некалькі цэнтраў галаўнога мозгу і яны пачынаюць разам камбінавацца. Мозг павінен бачыць, чытаць і адначасова слухаць. Калі некалькі цэнтраў дзейнічаюць разам, галаўны мозг пачынае працаваць лепш.

Важна развіваць тактыльныя адчуванні. Самае простае, што рэкамендуюць нейрабіёлагі, — узяць манеты і пальцамі імкнуцца вызначыць, якія лічбы на іх напісаны, дзе арол і рэшка, не гледзячы на іх. Практыкаванне таксама трэніруе розныя цэнтры галаўнога мозгу. Гэта простыя, але вельмі эфектыўныя рэчы.

***— Якія вітаміны патрэбны галаўному мозгу?***

— У нашым арганізме ўсе вітаміны працуюць у камандзе. Дрэнна ўплывае на галаўны мозг недахоп вітамінаў D і E. Таму рэкамендуецца здаць аналізы, каб ведаць іх узровень у арганізме і пры недахопе прымаць. Нармальнае функцыянаванне мозгу залежыць і ад наяўнасці ў арганізме дастатковай колькасці вітамінаў A, C, K і групы B. Для добрай работы мозгу важна прысутнасць у арганізме дастатковай колькасці жалеза, фоліевай кіслаты і поліненасычаных тлустых кіслот амега-3.

***— Як алкаголь уплывае на галаўны мог? Якая яго бяспечная доза?***

— Ёсць меркаванне, што алкаголь у невялікіх дозах, напрыклад, бакал добрага віна, паляпшае памяць і станоўча ўплывае на здароўе. Апошняе даследаванне вучоных паказала, што арганізм маладых людзей нашмат больш адчувальны да алкаголю, чым старэйшых. Узрост ад 15 да 39 гадоў лічыцца небяспечным для ўжывання алкаголю, і толькі пасля 40 гадоў гэта менш небяспечна.

Для напояў з утрыманнем спірту да 13 працэнтаў, гэта віно, небяспечнай лічыцца доза да 100 мл у дзень. Калі 3,5 працэнта спірту, гэта піва, — 370-550 мл, дзве невялікія бутэлькі, а калі 40 працэнтаў, моцныя алкагольныя напоі, — да 30 мл.

Калі ўзрост меншы, чым 40 гадоў, то бяспечная доза для мужчыны — 1/10 ад названага вышэй, для жанчыны — 1/4.

Магчыма, слабыя алкагольныя напоі ў невялікай колькасці могуць крыху актывізаваць участкі галаўнога мозгу, але гэта не сведчыць пра тое, што чалавек палепшыць сваё здароўе з дапамогай алкаголю.

**«Спадзявацца на чароўную таблетку не варта. Прэпараты, вядома, могуць палепшыць сітуацыю, але адным імі не абысціся. Павінен быць комплекс мерапрыемстваў, якія дапамогуць як прафілактаваць узроставыя наступствы, так і крыху аднавіць здольнасці, калі яны пачалі страчвацца».**

Акрамя таго, алкаголь мае адну не вельмі прыемную ўласцівасць для галаўнога мозгу. Было праведзена даследаванне паміж выдатнікамі аднаго з універсітэтаў. Іх падзялілі на тры групы і далі прайсці тэст. Усе групы рашылі яго на выдатна. Пасля першая група не ўжывала алкаголь, другая тыдзень ужывала алкаголь умерана, трэцяя — крыху больш, чым умерана. І зноў іх папрасілі рашыць той жа тэст.

Першая група, якая не ўжывала алкаголь, справілася на выдатна, другая — на 15—20 % горш, а трэцяя паказала яшчэ больш дрэнныя вынікі. Такім чынам, вучоныя прыйшлі да высновы, што людзі, якія ўжываюць алкаголь больш нормы, з часам страчваюць тыя навыкі, якімі валодаюць, асабліва калі чалавек займаецца не фізічнай, а разумовай працай.

**Алена КРАВЕЦ.**



# ТЭХАСКАЯ ГРЫЗНЯ

## Куды рушыць амерыканскі штат «адзінокай зоркі»?

**Губернатар амерыканскага штата Тэхас Грэг Эбат аб'явіў аб пачатку будаўніцтва вайсковай базы ў горадзе Ігл-Пас недалёка ад граніцы з Мексікай для стрымлівання нелегальнай іміграцыі. Эбат растлумачыў, што на базе будуць размяшчацца да 1800 салдат з магчымасцю пашырэння да 2300 вайскоўцаў, паведаміла ТАСС. «Новы ваенны лагер, які дасць магчымасць нацыянальнай гвардыі Тэхаса палепшыць правядзенне аперацый у гэтым раёне», — сказаў Грэг Эбат. Як вядома, напружанасць паміж уладамі штата Тэхас і Белым домам з-за наплыву нелегальных мігрантаў з Мексікі абвастрылася напрыканцы студзеня. Тэхаскі губернатар заявіў, што гатовы да канфлікту з федэраламі дзеля абароны граніц. Раней улады штата прыцягнулі мясцовую нацыянальную гвардыю для абароны ад патоку нелегальных мігрантаў, а таксама пачалі будаўніцтва сцяны з калючага дроту. Новы міграцыйны закон Тэхаса, які набудзе моц 5 сакавіка, дазволіць тэхаскім уладам арыштоўваць і дэпартаваць людзей, якія падазраюцца ў незаконным перасячэнні граніцы. Куды ж рушыць амерыканскі штат «адзінокай зоркі»?**

### Нелегалы, зброя, наркотыкі

Паток людзей, якія незаконна перасякаюць амерыканскую граніцу, дасягнуў небывалых маштабаў. Так, у снежні мінулага года з боку Мексікі ў ЗША прыбылі 225 тысяч нелегальных мігрантаў. Гэта рэкордны паказчык з 2000-га. Агулам за час прэзідэнцтва Байдэна ў ЗША прыбылі каля чатырох мільёнаў мігрантаў. І гэта толькі афіцыйныя даныя, адзначыла БелТА. Сітуацыя пагаршаецца тым, што разам з мігрантамі на тэрыторыю ЗША пападае зброя і наркотыкі. У амерыканскіх СМІ неаднаразова пісалі, што ў Злучаных Штатах вылілася апіоідная эпідэмія. Штогод яе ахвярамі становяцца каля 100 тысяч жыхароў краіны.

Толькі ў 2022 годзе паліцыя Тэхаса канфіскавала на тэрыторыі штата больш за 385 мільёнаў смяротных доз апіоіду фентанілу, які завозіцца ў ЗША пераважна з Мексікі. Па словах губернатара Грэга Эбата, такога аб'ёму хапіла б, каб «забіць усё насельніцтва Злучаных Штатаў». Вінаватым у апіоіднай эпідэміі, як і ў цэлым у міграцыйным крызісе, па яго меркаванні, з'яўляецца не хто іншы, як дзейны прэзідэнт ЗША. Губернатар Тэхаса неаднаразова ўказваў на няздольнасць Байдэна гарантаваць бяспеку дзяржаўнай граніцы і абараніць уласных грамадзян. Бяздзейнасць Вашынгтона заахвоціла Эбата прыняць шэраг самастойных рашэнняў па абароне Тэхаса ад нелегальнай міграцыі. Аднак у Белым доме такое самаўпраўства не ацанілі.

### «Туры» для мігрантаў

Працягласць граніцы паміж ЗША і Мексікай складае больш за 3,1 тысячы кіламетраў, з іх каля дзвюх тысяч кіламетраў прыпадае на Тэхас. Улады штата выдатна разумелі, што гарантаваць бяспеку і спыніць некантраляваны паток нелегальных мігрантаў з тэрыторыі Мексікі сваімі сіламі будзе няпроста. Таму спачатку Эбат спрабаваў пераканаць федэральныя ўлады ў неабходнасці ўмацаваць граніцу, прасіў вылучыць на гэтыя мэты фінансаванне, звяртаўся ў суды. Паралельна з гэтым губернатар Тэхаса распачаў шэраг праваахоўчых крокаў, якія выклікалі ў ЗША далёка неадназначную рэакцыю. У прыватнасці, Эбат пачаў арганізоўваць для мігрантаў бясплатныя рэйсы да Вашынгтона.

Першыя аўтобусы з мігрантамі накіраваліся ў сталіцу ў красавіку 2022 года. Каб федэральныя ўлады па заслугах ацанілі такі крэатыў, Эбат адправіў два аўтобусы наўпрост да рэзідэнцыі віцэ-прэзідэнта ЗША Камалы Харыс. Каля дзвярэй Харыс высадзіліся каля 100 чалавек, якія незаконна трапілі на тэрыторыю ЗША з Венесуэлы, Калумбіі, Мексікі і Уругвая. Услед за Вашынгтонам аўтобусы з мігрантамі пачалі прыбываць у Нью-Ёрк і Чыкага. Ініцыятыву Эбата падтрымалі губернатары Арызоны і Фларыды. Для паўднёвых штатаў, якія нясуць асноўны цяжар міграцыйнага крызісу, выпраўленне мігрантаў у той жа Вашынгтон ці Нью-Ёрк, бліжэй да федэральных улад, стала своеасаблівай акцыяй пратэсту. Аднак знайшлося нямала тых, хто выступіў з асуджэннем падобнай практыкі. Сам Эбат, каментуючы інфармацыю аб масавай адпраўцы мігрантаў у штаты Нью-Ёрк і Вашынгтон, заявіў, што такім чынам ён абараняе дзяржаўную граніцу, у той час як адміністрацыя амерыканскага лідара Джо Байдэна ў гэтым пытанні нічога не робіць.

На фоне масавага прыбыцця мігрантаў з Тэхаса і Арызоны ўлады Вашынгтона заявілі аб гуманітарным крызісе і запыталі дапамогу ў нацыянальнай гвардыі і адміністрацыі Байдэна, паведаміла БелТА. Аднак у Мінабароны ЗША адмовіліся прадаставіць падтрымку штату. Забілі трывогу і ў Нью-Ёрку. З вясны 2022-га да верасня 2023-га ў мегаполіс прыбылі больш за 110 тысяч мігрантаў. Мэр горада Эрык Адамс заявіў, што цэнтры ўтрымання бежанцаў перапоўнены, і калі сітуацыя не вырашыцца, то людзей давядзецца размяшчаць у Цэнтральным парку на Манхэтэне. Па словах Адамса, міграцыйны крызіс можа разбурыць Нью-Ёрк. У сувязі з гэтым мэр звярнуўся па дапамогу да Белага дома. Аднак адміністрацыя Байдэна ў чарговы раз самаўхілілася. Тым часам улады Тэхаса пачалі перапраўляць мігрантаў у іншыя штаты не толькі аўтобусамі, але і самалётамі. Першы такі рэйс быў выкананы напрыканцы мінулага года. Самалёт, на борце якога знаходзіліся больш за 120 мігрантаў, быў накіраваны ў Чыкага.

«Тэхас вывеў аперацыю «Адзінокая зорка» на новы ўзровень. Я падпісаў новыя гістарычныя законы, якія дапамогуць абараніць наш штат і нашу нацыю ад безразважнай палітыкі адкрытых граніц Байдэна. Тэхас пашырыў дзейнасць, уключыўшы ў яе рэйсы ў Чыкага», — напісаў Эбат у сацсетκі. Усяго з 2022 года з Тэхаса былі вывезены больш за 100 тысяч нелегальных мігрантаў.

### Супраць федэралаў

Разам з адпраўкай мігрантаў у іншыя штаты ўлады Тэхаса прынялі шэраг экстраных мер па ўзмацненні бяспекі. «Я прымяніў адпаведныя палажэнні канстытуцыі ЗША і штата Тэхас, каб прыняць беспрэцэдэнтныя меры для абароны нашага штата ад уварвання», — заявіў губернатар у лістападзе 2022 года. Эбат паведаміў, што на граніцы Тэхаса будуць размешчаны байцы Нацыянальнай гвардыі ЗША і супрацоўнікі Дэпартамента грамадскай бяспекі штата, якія зоймуцца выяўленнем, затрыманнем і выправаджэннем нелегальных мігрантаў, а таксама ўзвядзеннем дадатковых ахоўных збудаванняў, патруляваннем рэк і азёр.

У лютым мінулага года ўлады Тэхаса аднавілі будаўніцтва сцяны ўздоўж граніцы з Мексікай. «Тэхас будуе ўласную пагранічную сцяну», — паведаміў Эбат. Праект распрацоўваўся на працягу некалькіх месяцаў. Кошт кантракта з будаўнічай кампаніяй ацэньваецца ў $167 млн. Улетку мінулага года ўлады Тэхаса пачалі ўсталёўваць загароды ўздоўж ракі Рыа-Грандэ, уздоўж якой праходзіць граніца паміж ЗША і Мексікай. Паводле слоў Эбата, бар'ер закліканы абараніць Тэхас ад наплыву мігрантаў, а таксама ад увозу зброі і наркотыкаў з Мексікі.

Самаўпраўства Тэхаса ўсё ж не засталося незаўважаным. Адміністрацыя Байдэна заявіла, што ўлады штата ўмешваюцца ў пытанні міграцыйнага і пагранічнага кантролю, якія знаходзяцца ў федэральным веданні. Пытанне было вынесена на ўзровень Вярхоўнага суда, які вынес рашэнне на карысць федэральных улад. Згодна з пастановай суда, пакуль вядзецца судовы разбор, патрулі пагранічнай службы маюць права прыбраць драцяную агароджу даўжынёй каля 48 кіламетраў на амерыкана-мексіканскай граніцы ў Тэхасе. Аднак улады Тэхаса рашэнню суда падпарадкавацца адмовіліся. Нацыянальная гвардыя штата ўзяла пад кантроль адзін з прыгранічных участкаў у горадзе Ігл-Пас, заблакаваўшы доступ да граніцы супрацоўнікам федэральнай пагранічнай службы.

Міністэрства ўнутранай бяспекі запатрабавала ад улад Тэхаса забяспечыць доступ да граніцы агентам федэральнага пагранічнага патруля. Адпаведны ліст быў таксама накіраваны генеральнаму пракурору Тэхаса Кену Пакстану. Аднак генпракурор адказаў адмовай. Больш за тое, улады Тэхаса далі зразумець, што маюць намер не толькі захаваць агароджы, але і пабудаваць новыя. Так, віцэ-губернатар Тэхаса Дэн Патрык паабяцаў працягнуць калючы дрот уздоўж усёй граніцы штата з Мексікай. Ён называе Байдэна пагрозай і заклікае «сысці з дарогі»: «Прэзідэнт Байдэн пагражае Тэхасу, паколькі мы выконваем работу па забеспячэнні бяспекі граніцы, а ён — не. Мы маем права абараняць наш штат і краіну». Пры гэтым віцэ-губернатар адзначае, што, калі б федэральныя ўлады ні спрабавалі перарэзаць калючы дрот, тэхасцы будуць працягваць аднаўляць агароджу.

### У чаканні «тэкзіту»

Эбата падтрымалі яго калегі-рэспубліканцы з 25 штатаў ЗША. Яны апублікавалі сумесную заяву, у якой прызналі канстытуцыйнае права на самаабарону. Паводле звестак тэлеканала Fox News, калектыўны ліст Байдэну накіравалі генеральныя пракуроры 26 рэспубліканскіх штатаў. У лісце гаворыцца аб праве Тэхаса на абарону: «Гэта ўварванне, а штаты павінны мець магчымасць абараняць сябе ад уварвання».

Улады Тэхаса таксама звяртаюцца да сацыялагічных апытанняў, якія паказваюць, што меркаванне амерыканскага грамадства на баку паўднёвага штата. «Амаль 70 % амерыканцаў падтрымліваюць узвядзенне Тэхасам загарод на мяжы, каб не дапусціць перасячэння граніцы нелегальнымі мігрантамі, у тым ліку 53 % рашуча падтрымліваюць гэтую акцыю. Я буду працягваць змагацца за амерыканцаў і за самаабарону Тэхаса», — напісаў Эбат у сацсетцы X. Пры гэтым губернатар заяўляе, што гатовы да канфлікту паміж Тэхасам і федэральнымі ўладамі. «Калі гэтая малаверагодная падзея ўсё ж адбудзецца, мы будзем гатовыя і далей рабіць тое, чым займаліся на працягу апошняга месяца, а менавіта — узводзіць бар'еры», — заявіў Эбат.

Са словамі падтрымкі ў адрас тэхаскага губернатара і рэзкай крытыкай адміністрацыі Байдэна выступіў Дональд Трамп. «Байдэн падбухторвае да масавага ўварвання мільёнаў нелегальных мігрантаў у ЗША. Замест таго каб змагацца і абараняць нашу краіну ад гэтага нападу, Байдэн, што неверагодна, змагаецца за тое, каб звязаць рукі губернатару Грэгу Эбату», — напісаў Трамп у сацсетцы Truth Social. Ён таксама заклікаў іншыя амерыканскія штаты аказаць садзейнічанне Эбату ў абароне мяжы. Трамп адзначыў, што цяперашняя сітуацыя на паўднёвай мяжы стала зброяй масавага разбурэння краіны. Пры гэтым экс-прэзідэнт паўтарыў сваю вядомую фразу аб тым, што Амерыка коціцца ў пекла. У сувязі з гэтым ён адзначыў, што з-за масавага наплыву мігрантаў у ЗША могуць адбыцца тэракты. Апасенні наконт будучыні краіны выказаў кангрэсмен Клей Хігінс. На яго думку, ЗША можа пагражаць грамадзянская вайна. «Я думаю, што федэралы развязваюць грамадзянскую вайну, а Тэхас павінен стаяць на сваім», — напісаў Хігінс у сацсетцы X.




Не варта забываць і пра тое, што Тэхас — адзін найважнейшых штатаў у структуры эканомікі ЗША. Тут пражывае больш за 30 мільёнаў чалавек, якія выпрацоўваюць для краіны амаль 10 працэнтаў ВУП. Калі б Тэхас быў краінай, то ўваходзіў бы ў дзясятку найбуйнейшых сусветных эканомік. Як казаў экс-губернатар штата Рык Пэры, гэта «ўнікальнае месца, вельмі незалежнае па сваім духу». І размовы аб так званым «тэкзіце» — выхадзе штата са складу ЗША — узніклі зусім не на пустым месцы. Тым больш, што ў гісторыі Тэхаса ўжо быў перыяд незалежнасці — ён існаваў як асобная рэспубліка з 1836-га да 1845-га, паміж аддзяленнем ад Мексікі і ўваходжаннем у склад ЗША. Тады кангрэс зацвердзіў сцяг дзяржавы — чырвона-бела-блакітнае палотнішча з зоркай. Менавіта гэта і стала падставай для таго, што пасля Тэхас пачалі называць штатам «адзінокай зоркі».

Тым часам стала вядома, што ў красавіку на экраны выйдзе фільм брытанскага рэжысёра Алекса Гарланда «Грамадзянская вайна». У ім апісваюцца магчымыя падзеі найбліжэйшай будучыні ў ЗША. Па сцэнарыі, штаты аб'явілі вайну Вашынгтону, прычым альянсы ўтварыліся вельмі мудрагелістыя. Напрыклад, на штурм амерыканскай сталіцы ідуць аб'яднаныя войскі Каліфорніі і Тэхаса...

**Захар БУРАК.**

# ТУТ ЗАЎСЁДЫ ПАВІННА ВІРАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ

## Лыжная траса была жывым калідорам

Савецкія біятланісты былі настолькі паспяховыя на міжнародных спаборніцтвах, што ў 1972 годзе Міжнародны саюз біятланістаў прыняў рашэнне даверыць правядзенне чэмпіянату свету 1974 года Савецкаму Саюзу. Хутчэй за ўсё, для спартыўных кіраўнікоў гэтая навіна і добрая, і дрэнная адначасова. Ва ўсім Савецкім Саюзе было вельмі мала добрых зімовых комплексаў, а біятлонных стадыёнаў не было ўвогуле. А Міжнародны саюз біятланістаў прад'явіў да месца правядзення чэмпіянату мноства патрабаванняў: мяккі зімовы клімат, перасечаная мясцовасць, блізкае размяшчэнне да аэрапорта і вакзала. Першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў і старшыня спарткамітэта БССР Віктар Лівенцаў унеслі прапанову аб будаўніцтве комплексу (за два гады да правядзення чэмпіянату!) у Беларусі. Выбіралі паміж Лагойскам і Раўбічамі, якія размешчаны бліжэй да Мінска, што і стала вырашальным. Выканаць на першы погляд невыканальную задачу даручылі архітэктару Вальмену Аладаву, які ўзначальваў інстытут «Белгіпрагандаль», і канструктару Мацвею Гордзіну. Досведу будаўніцтва біятлонных стадыёнаў, як можна здагадацца, у іх не было. Спецыялісты накіраваліся ў Мурманск на чэмпіянат СССР. Убачыўшы спартсменаў толькі на старце, правеўшы вачыма аўтобус з суддзямі, якія ехалі за імі, прагуляўшыся па гурбах праз лінію агню да фінішу, яны зразумелі, як будаваць стадыён не трэба. І распрацавалі ўнікальны на той момант праект біятлоннага стадыёна, на якім упершыню ў СССР былі месцы для балельшчыкаў, адкуль было відаць лыжную трасу і стрэльбішча. Праектаванне пачалося ў 1973 годзе, а ў 1974-м ужо былі гатовы гасцініца, судзейскі павільён, стрэльбішча, лыжныя трасы, трыбуны для гледачоў — акурат да чэмпіянату свету. Атрымліваецца, беларусы першыя пабудавалі комплекс, дзе людзям было камфортна глядзець біятлонныя спаборніцтвы. Пазней гэтую ідэю будуць выкарыстоўваць і пры будаўніцтве біятлонных стадыёнаў за мяжой.

Сказаць, што чэмпіянат свету 1974-га ў «Раўбічах» зрабіў фурор — не сказаць нічога. Да гэтага часу жывыя ўспаміны, як у «Раўбічы» з'язджаліся аўтобусы, бітком забітыя людзьмі. У спарткомплексе сабралася больш за 100 тысяч балельшчыкаў. «Уся траса была суцэльным жывым калідорам, людзі стаялі ў пяць радоў. Спартсмен можа толькі марыць аб такой падтрымцы гледачоў. І мне гэта дапамагло, на чэмпіянаце свету 1974 года ў «Раўбічах» я стаў пераможцам у эстафеце. Гэты медаль — адзін з самых каштоўных для мяне. На родзе зямлі выступаць заўсёды цяжка. Але вельмі лёгка і прыемна трэніравацца, таму ў «Раўбічах» я правёў не адзін збор», — распавядаў у інтэрв'ю «Звяздзе» Аляксандр Ціханаў, чатырохразовы алімпійскі чэмпіён па біятлоне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Аляксандр ХАНДОГІН.

У складзе той эстафетнай каманды, якая стала пераможцам чэмпіянату свету 1974 года, выступаў і мінчанін Юрый Калмакоў. У гісторыі беларускага біятлона гэта першы залаты медаль.

Праўда, для арганізатараў было не ўсё так добра. 50 гадоў таму ў лютым ужо ўсталявалася плюсавая тэмпература — снегу катастрафічна не хапала, яго звазілі на лыжныя трасы з найбліжэйшых лясоў. Надвор'е, дарэчы, шмат гадоў будзе дастаўляць гаспадарам комплексу шмат галаўнога болю.

## Гэтае месца прыцягвае людзей

Пасля чэмпіянату свету па біятлоне 1974 года ўвесь свет даведаўся пра «Раўбічы». Сюды сталі з'язджацца прафесійныя спартсмены і аматары здаровага ладу жыцця. «У савецкі час у Беларусі было не так ужо і шмат спартыўных аб'ектаў высокага ўзроўню. Палац спорту, палац тэніса і воднаспартыўны камбінат у Мінску былі ў лідарах. Усе добра ведалі «Стайкі», Мекку для летніх відаў спорту. А «Раўбічы» сталі цэнтрам прыцягнення зімнікаў», — адзначае Аляксандр Пятровіч Хандогін, з 1990 да 2003 года — дырэктар комплексу, які ведае пра яго ўсё і нават больш. Аляксандр Пятровіч адзначае, што галоўная асаблівасць «Раўбічаў» у тым, што гэтае месца само прыцягвае людзей. Ён у гэтым пераканаўся на ўласным досведзе.

«У канцы 80-х я працаваў першым намеснікам старшыні Дзяржкамспорту. Работа папяровая, фінансы, дакументы, справаздачы. Пазней стаў курыраваць зімовыя віды спорту, і мяне прызначылі выканаўчым дырэктарам арганізацыйнага камітэта чэмпіянату свету па біятлоне 1990. За час работы ў аргкамітэце я закахаўся ў «Раўбічы», у калектыў комплексу. Лётаў на верталёце, аглядаў наваколлі ў пошуках снегу, кантраляваў уладкаванне лыжных трас. Цікавых спраў — безліч. Пасля гэтага зразумеў: у кабінет да папяровай работы не вярнуся. І сам папрасіў кіраўніцтва перавесці мяне ў «Раўбічы». І, мусіць, разгуляліся гены бацькоў, якія ўсё жыццё прапрацавалі ў сельскай гаспадарцы, — пацягнула на прыроду. Да гэтага я ніколі не быў дырэктарам спартыўнай базы, але адчуваў, што спраўлюся. Я сам абраў свой лёс і ў «Раўбічы» пайшоў працаваць з радасцю. Праца была надзвычай цікавая. А час — няпросты. З 1990-га да 2000-га спорту было вельмі складана. Але ў нас склаўся малады, актыўны калектыў, які знаходзіў выйсце з самых складаных сітуацый», — успамінае Аляксандр Пятровіч.

## Падрыхтоўка снегу — пытанне нумар адзін

Усе 50 гадоў у «Раўбічах» віравала жыццё. Часы мяняюцца, а той факт, што тут усім добра, застаецца нязменным. У свой час «Раўбічы» наведаў прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Хуан Антоніа Самаранч, які на пачатку 1990-х сур'ёзна паўплываў на станаўленне алімпійскага руху ў Беларусі. Пасля распаду Савецкага Саюза менавіта тут вырашаўся лёс спорту. У снежні 1991 года ў «Раўбічах» праходзіла нарада кіраўнікоў органаў кіравання спортам дзяржаў, якія ўваходзяць у СНД. Больш за 12 гадзін прадстаўнікі Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана, Таджыкістана, Расіі, Украіны выпрацоўвалі стратэгію і тактыку на час, які застаўся да Алімпійскіх гульняў 1992 года. Менавіта ў «Раўбічах» было вырашана, што на зімовых Алімпійскіх гульнях 1992 года ў Альбервілі і на летняй Алімпіядзе ў Барселоне спартсмены з былых савецкіх краін будуць выступаць аб'яднанай камандай. Нарад і сустрэч на высокім узроўні ў «Раўбічах» за 50 гадоў праходзіла нямала.



Але ўсё ж такі на першым месцы тут — спорт. А менавіта біятлон, бо комплекс і ўзнік дзякуючы біятлону. А гэта дастаткова патрабавальны від спорту. І яго галоўнае патрабаванне — снегавая падушка, з чым нярэдка ўзнікалі праблемы, часам крытычныя. У рамках чэмпіянату свету 1990 года ў «Раўбічах» удалося правесці толькі дзве індывідуальныя гонкі ў мужчын і жанчын. Спрынтарскія гонкі, камандныя гонкі, эстафеты праходзілі на замежных комплексах. Правесці чэмпіянат па поўнай праграме ў Беларусі перашкодзіла анамальна цёплае для лютага надвор'е. Як ні стараліся арганізатары, захаваць дастатковы ўзровень снегу на трасах не ўдалося. «Падрыхтоўка снегу для комплексу «Раўбічаў» заўсёды была пытаннем нумар адзін. Мы нават жартавалі, што калі перажылі зімовы сезон і справіліся са снегам, то сезон прайшоў паспяхова. Зрабіць штучны снег, выкласці яго на лыжную трасу — няпростая, але надзвычай важная праца. Пасля чэмпіянату свету 1990 года стала зразумела, што нам патрэбны снегавыя пушкі. Мы купілі тры ў Фінляндыі. Уважліва вывучылі, зрабілі сваю беларускую пушку. Савет Міністраў выдзеліў нам два мільёны беларускіх «зайчыкаў», і сумесна з Акадэміяй навук і гадзіннікавым заводам мы зрабілі сваю ўстаноўку. І яна даволі нядрэнна працавала, 500 метраў трасы рабіла. Мы ўвесь час жылі ў такіх сітуацыях, калі трэба было выкручвацца, знаходзіць варыянты, праяўляць кемлівасць. Зверху над намі ніхто не стаяў і як рабіць, нічога не казаў — усе свае праблемы вырашалі самі з дапамогай сяброў. У 1991 годзе этап Кубка свету па лыжных гонках перанеслі з Масквы ў «Раўбічы». Трасы рыхтавалі ўсе. Снег укладвалі ўсе — нават зборныя па веславанні, беларуская і ўкраінская, якія знаходзіліся ў «Раўбічах» на зборах. Нам патрэбна была дапамога, ім — трэніроўка па агульнафізічнай падрыхтоўцы», — расказвае Аляксандр Пятровіч.

У 1996 годзе Міжнародны саюз біятланістаў прысвоіў комплексу катэгорыю «А», выдаўшы ліцэнзію на правядзенне спаборніцтваў найвышэйшага ўзроўню без абмежаванняў. І такія спаборніцтвы тут праходзілі і праходзяць. У 1999 годзе «Раўбічы» прымалі летні чэмпіянат свету па біятлоне. Чэмпіянаты Еўропы 1998, 2004, 2019 і 2020 таксама праходзілі тут. А чаго варты біятлонны фестывальны «Гонка легенд», ініцыятарам якога стала Дар'я Домрачава. Спартыўнае свята ў «Раўбічах» збірала дзясяткі зорак біятлона і сотні балельшчыкаў, якія заставаліся ў захапленні.

## Найлепшая матывацыя

Зрэшты, спарткомплекс — гэта не толькі біятлон. Да дэнамінацыі на адной з беларускіх купюр быў намаляваны схіл для фрыстайла, размешчаны ў «Раўбічах». Першыя крокі спорт, які прынёс Беларусі чатыры алімпійскія залатыя медалі, зрабіў менавіта тут. «Федэрацыю фрыстайла ўзначальваў мой сябар Аляксандр Бітус. Разам са сваім маскоўскім калегам ён на ўсе лады расхвальваў фрыстайл, яны ж і ўгаворвалі мяне пабудаваць у «Раўбічах» схіл. Справа добрая, грошы ў комплексу былі, і мы пачалі будаваць. Праўда, спартыўнае кіраўніцтва энтузіязму не падтрымала, бо тады пра фрыстайл у Беларусі ведалі мала. Усё змянілася на Алімпійскіх гульнях 1994 года ў Лілехамеры. Наш Аляксей Парфянкоў пасля адборачнага этапу быў першым, на яго ўжо медаль павесілі. А ён ці то перахваляваўся, ці то проста не пашанцавала, у фінале стаў толькі 12-м. Крыўдна, канешне. Але самае галоўнае, што нашы кіраўнікі ўбачылі: фрыстайл — цікавы від спорту, відовішчны, захапляльны, а самае важнае — беларусы могуць годна выступаць. Вырашылі, што развіваць фрыстайл у краіне трэба. Нам далі дабро на будаўніцтва схілу ў «Раўбічах». У 1995 годзе мы ўжо праводзілі этап Кубка Еўропы па фрыстайле. А ў 1998-м, нагадаю, Дзмітрый Дашчынскі стаў бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў», — адзначае Аляксандр Пятровіч.

Этапы Кубка Еўропы па фрыстайле ў Раўбічах адбыліся яшчэ ў 2006 і 2020 гадах. Усе спаборніцтвы праходзілі на тым самым трампліне, пабудаваным дзякуючы энтузіязму і ініцыятыўнасці неабыякавых да спорту людзей. У мінулым годзе завяршылася сур'ёзная рэканструкцыя акрабатычнага схілу. Як адзначаў цяперашні дырэктар «Раўбічаў», усе аб'екты спарткомплексу ўвесь час мадэрнізуюцца. Комплекс паслуг для насельніцтва пашыраецца і летам, і зімой. Спартыўны комплекс — жывы арганізм, які ўвесь час удасканальваецца. Бо так было заўсёды. А як можа быць інакш у месцы, якое, як магніт, прыцягвае самых розных людзей і ніколі не пакідае абыякавым?

«Для мяне «Раўбічы» — вялікая і вельмі важная частка жыцця. Гэта быў выдатны час. Мы стараліся тварыць, як бы цяжка ні было. У нас не было такіх магчымасцяў, фінансаў, як сёння. Але мы ўсё рабілі для спартсменаў і трэнераў. Разумелі, што калі мы ім не створым умовы, дык ніхто гэтага не зробіць. Само жыццё матывавала рабіць наш комплекс найлепшым», — дзеліцца Аляксандр Пятровіч.

## Гэта не закрытая база

Сёння каляндар комплексу не зіхаціць важнымі міжнароднымі спаборніцтвамі. Але этап Кубка Садружнасці па біятлоне, які прайшоў у пачатку студзеня, чарговы раз нагадаў, на якім высокім узроўні яны праходзяць у «Раўбічах». «Біятлон у «Раўбічах» — гэта заўсёды прыгожа. Цяпер гэта адназначна адзін з найлепшых біятлонных комплексаў Еўропы. Калі не найлепшы», — напісала ў сваім Telegram-канале расійская спартыўная журналістка Алена Вайцэхоўская. Таму трэба дачакацца, калі сусветны спорт перастане ліхаманіць і «Раўбічы» зноў прымуць найважнейшыя міжнародныя спаборніцтвы. А гэта комплексу жыццёва неабходна, запэўнівае Аляксандр Хандогін: «Мы былі шчаслівыя, калі ў «Раўбічах» праводзілі буйныя міжнародныя спаборніцтвы. Бо гэта рэклама для комплексу, сродкі на рэканструкцыю, цікавасць людзей. Спартыўнае жыццё ў «Раўбічах» павінна віраваць, асабліва прафесійнае. Ды і аматары, асабліва дзеці, павінны тут увесь час прысутнічаць. Дзе яшчэ яны могуць пакатацца на тых жа трасах, на якіх выступалі алімпійскія чэмпіёны. У «Раўбічах» трэба ўвесь час праводзіць мерапрыемствы, спаборніцтвы, прыцягваць сюды спартсменаў, каб людзі бачылі, што комплекс жывы. Гэта не закрытая база. Гэта комплекс для спартсменаў, для іх прыхільнікаў, для дзяцей, для турыстаў. Тут заўсёды паралельна са спевамі птушак павінны гучаць чалавечыя галасы, як гэта было на працягу 50 гадоў. Я хачу, каб комплекс і стагоддзе адзначаў. Але самае галоўнае, што да 100-гадовага юбілею ў «Раўбічаў» было яшчэ больш падстаў для гонару».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з асабістага архіва Аляксандра Хандогіна і БелТА.**

Закрытое акционерное общество

## «ОптиКурс» НКФО»

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 декабря 2023 г.
**ЗАО «ОптиКурс «НКФО»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1 | - | 28 763 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.2 | 803 | 9 927 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.3 | - | 55 978 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.4 | - | 321 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.5 | - | 47 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.6 | - | 11 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.7 | 315 | 7 175 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 5.8 | - | 213 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 5.9 | - | 67 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5.10 | 1 357 | 1 956 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 2 475 | 104 458 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 5.11 | - | 83 639 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 5.12 | 295 | 1 206 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 295 | 84 845 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 5.13 | - | 5 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 5.14 | 3 178 | 4 126 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 5.15 | - | 2 888 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.16 | (998) | 7 599 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 2 180 | 19 613 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 2 475 | 104 458 |

Директор ликвидатора
ЗАО «ОптиКурс» НКФО»
ООО «Лигал Ашуренс» Е.А.Костиневич

Дата подписания: 30 января 2024 г.

Отчетность о деятельности ЗАО «ОптиКурс» НКФО»
в полном объеме размещена на сайте www.optikurs.by:
«Главная/О НКФО/Раскрытие информации/
Финансовая отчетность»

УНП 100331707

## Аудиторское заключение

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «ОптиКурс» НКФО» (далее – «НКФО» или «аудируемое лицо») (место нахождения: 220012, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, д. 95; дата государственной регистрации: 30 марта 2000 года; регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 100331707), состоящей из: бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2023 года и примечаний к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, предусмотренных законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности небанковскими кредитно-финансовыми организациями.

По нашему мнению, прилагаемая годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение НКФО по состоянию на 31 декабря 2023 года в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности небанковскими кредитно-финансовыми организациями.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (с последующими изменениями и дополнениями), Инструкции «О регулировании аудиторской деятельности в банках, банковских группах и банковских холдингах», утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 декабря 2019 года № 495 (с последующими изменениями и дополнениями), и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к НКФО согласно требованиям законодательства и принципы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

За исключением обстоятельства, описанного в разделе «Важные обстоятельства», мы определили, что отсутствуют иные ключевые вопросы аудита, информацию о которых необходимо сообщить в нашем заключении.

**Важные обстоятельства**

Мы обращаем внимание на Примечание 2 к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, в котором описано, что допущение о непрерывности деятельности не применялось при подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в связи с тем, что в отношении НКФО инициирован процесс ликвидации. Наше аудиторское мнение не было модифицировано в отношении этого обстоятельства.

**Прочие вопросы**

Аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности НКФО по состоянию на 31 декабря 2022 года и за 2022 год был проведен другой аудиторской организацией, чье заключение от 14 февраля 2023 года содержало немодифицированное аудиторское мнение о той отчетности.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Руководство несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности небанковскими кредитно-финансовыми организациями, и организацию системы внутреннего контроля НКФО, необходимой для подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности руководство несет ответственность за оценку способности НКФО продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать НКФО, прекратить ее деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности НКФО.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (с последующими изменениями и дополнениями), Инструкции «О регулировании аудиторской деятельности в банках, банковских группах и банковских холдингах», утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 декабря 2019 года № 495 (с последующими изменениями и дополнениями), и национальных правил аудиторской деятельности, всегда выявляет существенные искажения при их наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (с последующими изменениями и дополнениями), Инструкции «О регулировании аудиторской деятельности в банках, банковских группах и банковских холдингах», утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 декабря 2019 года № 495 (с последующими изменениями и дополнениями), и национальных правил аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего аудиторского мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения аудиторского мнения об эффективности системы внутреннего контроля НКФО;
- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность бухгалтерских оценок и соответствующего раскрытия информации, подготовленного руководством;
- делаем вывод о правомерности применения руководством допущения о непрерывности деятельности, а на основании полученных аудиторских доказательств – вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности НКФО продолжать непрерывно свою деятельность. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующему раскрытию информации в годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности или, если такое раскрытие информации является ненадлежащим, модифицировать наше аудиторское мнение. Наши выводы основаны на аудиторских доказательствах, полученных до даты нашего аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что НКФО утратит способность продолжать непрерывно свою деятельность;
- проводим оценку представления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в целом, ее структуры и содержания, включая раскрытие информации, а также того, представляет ли годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность лежащие в ее основе операции и события так, чтобы было обеспечено их достоверное представление.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о существенных замечаниях по результатам аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, которые мы выявляем в процессе аудита.

Мы также предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что мы соблюдали все соответствующие этические требования в отношении независимости и информировали этих лиц обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать оказывающими влияние на независимость аудиторской организации, а в необходимых случаях – о предпринятых действиях, направленных на устранение угроз, или мерах предосторожности.

Из тех вопросов, которые мы довели до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы определяем вопросы, которые были наиболее значимыми для аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности за текущий период и, следовательно, являются ключевыми вопросами аудита. Мы описываем эти вопросы в нашем аудиторском заключении, кроме случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законом или нормативным актом или когда в крайне редких случаях мы приходим к выводу о том, что информация о каком-либо вопросе не должна быть сообщена в нашем заключении, так как можно обоснованно предположить, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее сообщения.

Руководитель задания **Становая Ольга Викторовна** (квалификационный аттестат аудитора № 0002468 от 3 октября 2018 года, рег. № 2201)

Доверенность № 05/03/23 от 24.03.2023

Руководитель аудиторской группы **Карней Алиса Игоревна** (квалификационный аттестат аудитора № 0002419 от 13 декабря 2017 года, рег. № 2160)

Общество с ограниченной ответственностью «Кэпт»
Член Самоуправляемой организации аудиторских организаций и аудиторов в Республике Беларусь «Аудиторская палата».
Юридический адрес: 220012, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Платонова, д. 49, помещение 26-7.
